Голас Радзімы

№21 (2111)
25 мая 1989 г.

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ТАВАРЫСТВА ПА КУЛЬТУРНЫХ СУВЯЗЯХ З СУАЙЧЫННІКАМІ ЗА РУБЯЖОМ
(БЕЛАРУСКАЕ ТАВАРЫСТВА «РАДЗІМА»)

Выдаецца з 1955 г.
Цана 4 кап.

● Мікалай ДАМІНІКАН з Героем Сацыялістычнай Працы дырэктарам жывёлагадоўчага комплексу «Мір» Мікалаем ДУДУКОМ.

● Мікалай ДАМІНІКАН і дырэктар эксперыментальнай базы «Вольна-Чарніхава» Леў АЛІФЕРКА.

● Любіць сакратар райкома родныя мясціны.

Фота Я. КОКТЫША.

САКРАТАР РАЙКОМА

Даўно вядома: вітрына сельскай гаспадаркі — гарадскі магазін. Вось з яго і трэба пачынаць, параіў сакратар райкома. Потым будзем бачыць, чаго мы дабіліся, чаго не. Праўда, асабліва хваліцца пакуль няма чым, але...

Мяне заўсёды прыцягвала ў гэтым чалавеку нестандартнасць мыслення. Першым сакратаром Баранавіцкага райкома партыі Мікалай Дамінікан выбраны 17 гадоў назад. Праўда, у кіраўніках і да таго яму даводзілася хадзіць нямала: старшыня калгаса, дырэктар эксперыментальнай базы, старшыня райвыканкома... Займаўся ў асноўным гаспадарчымі пытаннямі. Але нехта своечасова падмеціў, што больш за ўсё гэтага чалавека вызначае ўменне трымаць цесную сувязь з людзьмі, якія працуюць на «ніжніх» паверхах сельскай эканомікі — старшынямі калгасаў, брыгадзірамі, ды і простымі калгаснікамі. Гавару пра гэта не выпадкова: усё, чаго ён дабіўся ў раёне, чаго дасягнуў раён, дзякуючы яму, сёння ў многім атаясамліваецца з энергіяй партыйнага сакратара, яго ўменнем вылучыць галоўнае звяно ў ланцугу эканамічных задач. Ён заўсёды аказваўся на вастрыі ўзнікаючых у эканоміцы сельскай гаспадаркі праблем. І тое, што прапанаваў пачаць знаёмства з дзейнасцю аграпрамысловага комплексу Баранавіцкага раёна менавіта з вітрын гарадскіх магазінаў, ужо праз некалькі мінут мяне не здзіўляла: «багаццем» тое, што я ўбачыў, не назавеш. Але словы «значна лепш, чым у іншых раёнах» найбольш трапна вызначаюць убачанае.

Раён сапраўды выглядае выйгрышна ў эканамічных пытаннях у параўнанні з іншымі рэгіёнамі БССР. І тут, зразумела, не толькі заслуга Дамінікана. Але вось тое, што ён сумеў узняць культуру партыйнай работы на якасна новую ступень, у рэшце рэшт адбілася і на высокіх эканамічных паказчыках. Прывяду толькі дзве лічбы: 120 і 150 000. Першая — колькасць сельскагаспадарчых рабочых на аграпрамысловым прадпрыемстве «Мір» Баранавіцкага раёна Брэсцкай вобласці. Другая — колькасць гарадскіх жыхароў, якія могуць спажываць яго прадукцыю круглы год. Кожны работнік, які даглядае тут жывёлу, атрымлівае за год прадукцыі на 101 тысячу рублёў. Гэта самы высокі паказчык у жывёлагадоўлі не толькі ў Беларусі, але і ў краіне. Такі вопыт работы прыцягвае ўвагу многіх савецкіх спецыялістаў. І асабліва аўтарытэтным гучыць для іх заўсёды слова Мікалая Дамінікана, аднаго з таленавітых і дбайных гаспадароў раёна, Героя Сацыялістычнай Працы.

Р. КОЛАБАЎ.

БЕЛАРУСЬ У ААН

ПРЫЯРЫТЭТНАЯ ЗАДАЧА

Беларуская ССР заўсёды разглядала і разглядае барацьбу з расізмам і расавай дыскрымінацыяй у якасці прыярытэтнай задачы ААН, заявіў прадстаўнік БССР Ігар Цярноў, выступаючы ў Нью-Йорку на пленарным пасяджэнні сесіі экалагічнага і сацыяльнага савета ААН.

Прамоўца напомніў, што па законах БССР забаронена і крымінальна караецца распальванне нацыяналістычных і расавых прадузятасцей, існуе адміністрацыйная і судовая адказнасць за дыскрымінацыйныя дзеянні па прыкметах расы, нацыянальнасці, полу і інш.

І. Цярноў асудзіў бесчалавечную расісцкую палітыку ўрада Паўднёвай Афрыкі, указаўшы, што апартэід па-ранейшаму працягвае з'яўляцца пагрозай для міру, для ўсяго чалавецтва. БССР ужо неаднаразова заяўляла аб гэтым і робіць гэта сёння, падтрымліваючы вывад «спецыяльнай рабочай групы аб парушэннях правоў чалавека ў Паўднёвай Афрыцы». Міжнароднае таварыства павінна прыняць усеабдымныя санкцыі супраць рэжыму Прэторыі.

ДАСЯГНУТА ДАГАВОРАНАСЦЬ

КІТАЙ—ПРЫГРАНІЧНЫ ПАРТНЁР

Яшчэ адзін зарубежны спажывец—Кітайская Народная Рэспубліка—з'явіўся ў вытворчага аб'яднання «Беларускалій». Дасягнута дагаворанасць, што сёлета на безвалютнай аснове туды будзе адпраўлена тысяча тон мінеральных угнаенняў.

Існуе такая форма ўзаемавыгаднага абмену, як прыгранічны і прыбярэжны гандаль. Яна прадугледжвае пэўныя льготы для абодвух партнёраў. З гэтага года такі статус атрымалі БССР і Кітай. Магчыма, нехта здзівіцца: у іх жа няма агульнай дзяржаўнай граніцы. Але гэта ўмова не з'яўляецца абавязковай пры заключэнні падобных пагадненняў. Так што КНР пасля Польшчы і Югаслаўскай Рэспублікі Славеніі стала для БССР яшчэ адным партнёрам па прыгранічнаму гандлю.

У АКАДЭМІІ НАВУК

УКЛАД ВУЧОНЫХ

У Мінску адбылася сесія гадавога агульнага сходу Акадэміі навук рэспублікі. Уступным словам яе адкрыў прэзідэнт АН БССР акадэмік У. Платонаў.

З дакладам аб асноўных выніках развіцця навуковых даследаванняў выступілі віцэ-прэзідэнты АН БССР акадэмікі АН БССР А. Сцепаненка, І. Ліштван, У. Салдатаў, І. Навуменка. Вынікі навукова-арганізацыйнай работы прэзідыума акадэміі за 1988 год падведзены ў дакладзе галоўнага вучонага сакратара прэзідыума АН БССР акадэміка АН БССР А. Ганчарэнкі.

На сходзе адзначалася, што ў мінулым годзе творчыя намаганні вучоных акадэміі былі сканцэнтраваны на далейшым паглыбленні працэсаў перабудовы, паскораным развіцці фундаментальных даследаванняў, выкананні навуковых і навукова-тэхнічных праграм па прыярытэтных напрамках. Вялікая ўвага ў ходзе дыскусіі ўдзялялася замацаванню дэмакратычных прынцыпаў у кіраванні навукай, выбарнасці кіруючых кадраў, шырокай публічнасці.

СУСТРЭЧА ВЕТЭРАНАЎ

Цікавая падзея адбылася ў Мінску. Тут прайшла сустрэча савецкіх ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны і былых амерыканскіх салдат. У 1945 годзе ўсе яны былі ўдзельнікамі гістарычнай сустрэчы савецкіх і амерыканскіх войск на Эльбе.

НА ЗДЫМКУ: ініцыятар сустрэчы савецкіх і амерыканскіх ветэранаў генерал-лейтэнант у запасе Уладзімір АРЛОЎ, фермер са штата Паўночная Караліна Ілайджы СЭМС і вучоны эканаміст штата Паўночная Караліна Эдгар ПАРСАНС гутараць з ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны з беларускага гарадка Клецка.

УЗАЕМАВЫГАДНА

НА АСНОВЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА

На працягу некалькіх гадоў дзяржплемзавод «Індустрыя» Пухавіцкага раёна падтрымлівае сяброўскія сувязі з дзяржаўнымі гаспадаркамі Польскай Народнай Рэспублікі. Тут створана аддзяленне Таварыства савецка-польскай дружбы.

Партнёр племзавода—калектыў дзяржгаса «Саннікі» Плоцкага ваяводства. Прадстаўнікі гэтай гаспадаркі ўжо двойчы пабывалі тут. Пухавіцкіх земляробаў зацікавіла высокая культура земляробства польскіх сяброў.

Даведаліся пухаўчане, што польскія сябры займаюцца вырошчваннем азімага харчовага рапсу, зерне якога выкарыстоўваецца для вытворчасці алею. Набылі ў іх 100 кілаграмаў насення, размножылі яго ў сябе. Цяпер дзяржплемзавод мае магчымасць намнога пашырыць пасевы гэтай культуры. Хутка ад калектыву дзяржгаса «Саннікі» паступіць камбінаваная сеялка, якая дазваляе сеяць розныя культуры—ад маку да кукурузы.

Сельскагаспадарчая вытворчасць у Польшчы шматукладная: ёю займаецца і прыватны сектар, і дзяржаўны. Земляробы беларускай гаспадаркі таксама ўкараняюць у сябе сямейны падрад, арэнду. Таму ім ёсць чаму павучыцца ў польскіх сяброў.

ЖЫВЁЛАГАДОЎЛЯ

Каля сямі мільёнаў рублёў чыстага прыбытку атрымліваюць штогод у калгасе імя Горкага Пінскага раёна. Асноўную яго частку прыносіць жывёлагадоўля. Клапоцяцца ў гаспадарцы і аб умовах працы і быту даярак, даглядчыкаў жывёлы, пастухоў. На комплексах і буйных фермах абсталяваны Дамы жывёлавода, дзе можна адпачыць, прыняць душ, паглядзець тэлевізар.

НА ЗДЫМКУ: дойны статак калгаса на пашы.

МІЖНАРОДНЫЯ СУВЯЗІ

ВЫСТАЎКА НА КОЛАХ

Не спатрэбілася многа часу для разгортвання выстаўкі дацкай фірмы «Бруль ог К'ер», якая працавала ў міжнародным выставачным комплексе Мінска. Усе вымяральныя прыборы, на выпуску якіх спецыялізуецца фірма, размясціліся ў фургонах аўтамабіляў. Прадстаўнікі «Бруль ог К'ер» сустрэліся са спецыялістамі Беларускага аўтазавода, які выпускае кар'ерныя самазвалы вялікай грузападымальнасці. Аўтамабілебудаўнікі ўжо маюць прыборы дацкай фірмы, якія дапамагаюць пры канструяванні машын дакладна вызначыць узроўні вібрацыі і шуму тых або іншых вузлоў.

Загадчык аддзела экспарту дацкай фірмы Стэн Фалінг падкрэсліў, што яны гатовы заключаць гандлёвыя здзелкі непасрэдна на выстаўцы, прычым не толькі з дзяржаўнымі прадпрыемствамі, але і з кааператывамі. Кантракты могуць заключацца як на валютнай, так і на бартэрнай аснове, калі прадпрыемства-пакупнік расплачваецца сваёй прадукцыяй.

Фірма ўжо наладзіла сувязі з прадпрыемствамі Масквы, Ленінграда, Кіева і Новасібірска, дзе створаны тэхнічныя цэнтры па абслугоўванню прыбораў. Падобныя «апорныя» пункты дацкія спецыялісты хацелі б мець і ў Беларусі.

У ФОНД КУЛЬТУРЫ

У ЭКСПАНАТАХ — ЖЫЦЦЁВАЯ МУДРАСЦЬ

Падарунак тым даражэйшы, чым больш шчырыя пачуцці таго, хто яго дорыць. Гэта жыццёвая мудрасць знайшла сваё пацвярджэнне на выстаўцы, якая адкрылася ў Рэспубліканскім Доме работнікаў мастацтваў. На вернісажы «Дары Беларускаму фонду культуры» выстаўлена каля паўсотні работ жывапісцаў, графікаў, скульптараў, бясплатна перададзеных аўтарамі гэтаму новаму грамадскаму фарміраванню. Наведвальнікі, углядаючыся ў палотны і скульптуры, пераконваюцца: падораныя творы—сведчанне высокай грамадзянскай свядомасці аўтараў, іх асобага разумення ролі мастацтва ў развіцці грамадства, іх гатоўнасці прыняць асабісты ўдзел у дабрачынным руху.

Іх ужо нямала, дароў Фонду культуры: і грашовыя (ад некалькіх рублёў да тысяч), і дабрачынныя канцэрты на карысць фонду, і суботнікі, і карціны, якія дэманструюцца на гэтай выстаўцы, і многае іншае. Некаторыя дарыльшчыкі нават не ўказалі сваіх імёнаў, тым самым падкрэсліўшы: не дзеля славы робяць падарунак, а каб узняць узровень нацыянальнай культуры.

Сярод аўтараў, прадстаўленых на выстаўцы ў Доме мастацтваў, народны мастак БССР Леанід Шчамялёў, заслужаны дзеяч мастацтваў БССР Арлен Кашкурэвіч, вядомыя майстры пэндзля і разца Уладзімір Басалыга, Алена Лось, Аляксандра Паслядовіч, Уладзімір Лятун, Уладзімір Гоманаў, Георгій Лойка, Мікола Купава, Лазар Ран, Людміла Шчамялёва, Зоя Літвінава. Яны падарылі фонду лепшыя са сваіх работ, што расказваюць пра родны край, людзей, якія жывуць на гэтай зямлі, аб найбольш яркіх старонках гісторыі свайго народа.

На вернісажы мітрапаліт Мінскі і Беларускі Філарэт перадаў Беларускаму фонду культуры жывапіснае палатно XVI стагоддзя, якое належала царкве.

АКТУАЛЬНАЕ Ў ПРЭСЕ

УСВЯДОМЛЕНА ЦІ СІЛАЙ?

Адна з самых набалелых праблем, якая падзяліла нашу грамадскасць на антаганістычныя групы і групкі,—нацыянальная мова. Праводзіць беларусізацыю Беларусі ці не? А калі праводзіць, то як: добраахвотна, чакаць цярпліва, пакуль народ сам узнімецца да ўсведамлення, што яму патрэбна свая мова, ці прымусіць адміністрацыйна кожнага размаўляць па-беларуску? Гэтыя пытанні абмяркоўваліся нашымі інтэлектуаламі за «круглым сталом» у Інстытуце павышэння кваліфікацыі выкладчыкаў грамадскіх навук, прысвечаным тэме «Мастацкая літаратура, публіцыстыка і праблемы гуманітарнай адукацыі, выхавання выкладчыкаў і студэнтаў».

Як вынікае са справаздачы з гэтай дыскусіі, надрукаванай у газеце «Звязда», адзінага погляду на моўныя працэсы ў рэспубліцы за «круглым сталом» не было. Пісьменнік Барыс Сачанка адзначыў: «У нас мала чытаюць літаратуру. Нават многія вучоныя. Вось у чым бяда—ва ўзроўні адукаванасці. Нават Сталін раней чытаў усе творы, за якія давалася Сталінская прэмія, і мог паклікаць сакратара абкома або райкома і спытаць: «А памятаеце, як разважае Татарынаў? Гэта з якога твора?..» І сакратар абкома вымушаны быў чытаць мастацкую літаратуру.

Іншае пытанне—мова. Я ўзначальваю камісію ў Саюзе пісьменнікаў па выкладанню беларускай мовы і літаратуры ў школе. І гэтымі пытаннямі займаюся вельмі даўно. Ствараецца таварыства беларускай мовы, якое па ўсёй рэспубліцы займецца яе прапагандай. Пытанне складанае, нялёгка яго вырашаць. Я быў у адной аўдыторыі прапагандыстаў. Гэта былі загадчыкі парткабінетаў Мінска і Мінскай вобласці, сакратары райкомаў. Агульнай мовы нам, на жаль, знайсці не ўдалося. Была вельмі цяжкая дыскусія, дзе кожны чуў толькі сам сябе. Упершыню ў маім жыцці я многіх людзей не пераканаў.

Гаворка ідзе аб чым? Распрацоўваецца праграма «Родная мова», дзе ставяцца пытанні вельмі канкрэтна—дзяржаўная беларуская мова, абавязковае справаводства на роднай мове, без ведання дзвюх моў—рускай і беларускай—чалавек не можа быць на партыйнай, камсамольскай, выкладчыцкай і іншых пасадах. Рабочы, калгаснік няхай, як хочуць, гэта іх справа. Што ж датычыць вось гэтага грамадскага слоя,—абавязковае ведание дзвюх моў, а яшчэ лепш—трох, чатырох. Таму што сёння, калі мы думаем мець нейкія зносіны са светам, нам мала гэтых дзвюх моў. Вось аб чым ідзе гаворка. Ажыццявіць гэта нялёгка. Пачынаем мы з дзіцячых садоў, якія ў бліжэйшы час у большасці будуць беларускія. І з гэтага года ў Мінску адкрываецца 10 беларускіх школ. Адкрываюцца такія школы ў кожным горадзе. Гэта, вядома, непарадак быў, што карэнная нацыянальнасць—беларусы—у сваёй роднай сталіцы не маглі сваіх дзяцей вучыць на беларускай мове».

Прафесар І. Сярова выказала свой пункт погляду: «У дваццатыя гады ў Беларусі нароўні існавалі чатыры мовы: яўрэйская, беларуская, польская, руская. У тым ліку і надпісы на гербе былі на гэтых мовах. Дык чаму цяпер гаворка ідзе толькі аб беларускай? Чаму не гаворым аб стварэнні навучальных устаноў на польскай, яўрэйскай і іншых мовах? У Літве ёсць, а ў нас няма. Газеты польскай таксама ніводнай няма. І яшчэ (пытанне Б. Сачанку): наколькі ваша меркаванне аб беларусізацыі супадае з меркаваннем іншых людзей? У Магілёўскай вобласці мы правялі даследаванне. Звесткі ёсць, мы іх цяпер апрацоўваем. 52 працэнты беларусаў, 63—рускіх, каля 30—украінцаў, 40—яўрэяў, якія пражываюць там, лічаць, што беларусізацыя заўчасная. Трэба стварыць умовы для вывучэння мовы, падрыхтаваць дастатковую колькасць кадраў, а ўжо потым вырашаць праблемы пераводу справаводства і ўсяго іншага на беларускую мову. У Літве, Латвіі, Эстоніі гэта зрабілі па патрабаванню людзей. У нас—іншая сітуацыя. Такую сур'ёзную справу нельга вырашаць кавалерыйскім наскокам».

Барыс Сачанка выказаўся больш катэгарычна:

«Калі мы сёння кажам «нельга сілай», то, скажыце, колькі яшчэ і чаго мы робім сілай ва ўсіх сферах жыцця? Гэта ненармальнае становішча трэба ламаць. На беларускай мове створаны такія творы, што нам зайздросцяць усе,—мы монах Быкава чытаць у арыгінале! Мы павінны дапамагчы адчуць чалавеку, якая прыгожая беларуская мова. У нас не ставіцца так пытанне, як прыбалты паставілі: два гады на вывучэнне мовы, не вывучыў—калі ласка, выязджай з рэспублікі. Але нам балюча, калі сам беларус выступае супраць сваёй роднай мовы. Значыць, ён не дарос нават да нацыянальнай самасвядомасці».

З МАРКАЙ «БАРЫФОРГА»

Першую прадукцыю — пражу для ручнога вязання — выдала сумеснае савецка-венгерскае прадпрыемства «Барыфорг» у Барысаве. Венгерскі бок паставіў сучаснае абсталяванне, прыслаў спецыялістаў для яго ўстаноўкі і наладкі, дапамог будаваць памяшканне, у якім размясцілася высокапрадукцыйная вытворчасць. У асваенні магутнасцей разам з нашымі рабочымі прымалі ўдзел аператары і майстры, якія прыехалі з ВНР. Большасць з іх цяпер рыхтуецца да ад'езду на радзіму. А вось Марыя Новакне, якую ўсе ў інтэрнацыянальным калектыве называюць проста Марыкай, не збіраецца ехаць: яна — намеснік генеральнага дырэктара «Барыфорга». Разам з мужам, які ўзначаліць прадзільную вытворчасць, яна стане тут паўнамоцным прадстаўніком венгерскага аб'яднання «Тэмафорг», чыя тэхналогія ўкараняецца на прадпрыемстве.

Што ж дае савецка-венгерскае супрацоўніцтва сістэме Белкаапсаюза, у рамках якой дзейнічае «Барыфорг»! Перш за ўсё высокаякасную прадукцыю, на якую сёння вялікі попыт. Дарэчы, уся яна ў гэтым годзе будзе прадавацца толькі насельніцтву рэспублікі. А з павелічэннем выпуску выйдзе на рынкі не толькі нашай краіны, але і Венгрыі.

НА ЗДЫМКУ: прадукцыю «Барыфорга» дэманструе начальнік тэхнічнай лабараторыі Таццяна ПАЎЛАВЕЦ.

Фота А. НІКАЛАЕВА.

ШТО ЗА ЦУДЫ «ПРЫЖЫЛІСЯ» Ў РЭСПУБЛІЦЫ

НЕВЕРАГОДНАЕ І НЕЗВЫЧАЙНАЕ

Апошнім часам сродкі масавай інфармацыі часта паведамляюць нам пра незвычайныя з'явы ў прыродзе, пра амаль чароўныя здольнасці асобных людзей. Адносіны да гэтага ва ўсіх розныя. Адны лічаць апісваемае нейкім махлярствам або нечым накшталт фокусаў цыркавых ілюзіяністаў. Іншыя безагаворачна вераць у іх, у магутнасць нейкай звышнатуральнай сілы. Але абыякавым не застаецца практычна ніхто.

Некаторыя «цуды» прыжыліся і ў нас, на Беларусі. Пра іх расказвае журналіст Аляксандр ШАГУН.

У ПОШУКАХ ВЯСКОВАГА БІЯТЭРАПЕЎТА

Жыве ў вёсцы Пільшычы Бялыніцкага раёна Фядора Конюхава — жанчына незвычайных здольнасцей. Яна, гавораць людзі, нават нерухомых інвалідаў на ногі ставіць. І лекі ў яе чыстыя, прыродныя — сцюдзёная крынічная вада, гліна, свае рукі і душэўнае гаючае слова.

Але ці мала чаго нагавораць людзі або напішуць у газеце дзеля сенсацыі! У рэдакцыі мясцовай раённай газеты цуд не адверглі. Наадварот, партрэт Ф. Конюхавай «размалявалі» яшчэ больш сакавітымі фарбамі: напрыклад, сваёй незвычайнай вадой яна лечыць раны, экземы, алергію. І ўплыў Фядоры Данілаўны, паводле водгукаў, вельмі адчувальны. Яе выратавальная энергія як бы перадаецца хвораму чалавеку, і той папраўляецца літаральна на вачах.

Дачуліся пра феномен Конюхавай і вучоныя. Фатаграфавалі яе ў інфрачырвоных промнях, сачылі, ці выпраменьвае электрамагнітнае поле. Гідрагеолагі з Інстытута геахіміі і геафізікі АН БССР вырашылі зрабіць поўны біяхімічны аналіз яе гаючай крыніцы.

— Значыць, і вы верыце ў выключныя магчымасці студні ў Бялынічах? — запытаў я ў доктара геолага-мінералагічных навук А. Кудзельскага.

— Вада нярэдка валодае моцнай лекавай сілай,— паведаміў прафесар. І зрабіў невялікі экскурс да «анатоміі» «жывых» крыніц Беларусі.— Яны, зразумела, менш вядомыя, чым воды Карлавых Вар, Сочы-Мацэсты альбо Трускаўца. Але служаць чалавеку гэтак жа надзейна, вяртаюць яму бадзёрасць і здароўе. Даўно і паспяхова выкарыстоўваюцца для лячэння страўнікава-кішэчных і іншых захворванняў сульфатна-хларыдна - натрыевыя падземныя воды ў санаторыях «Крыніца» (непадалёк ад Мінска), «Лётцы» (Віцебшчына) і «Нарач». Добрая слава ідзе аб хларыдна-натрыевай вадзе санаторыя імя Леніна ў Бабруйску, якая з'яўляецца незаменнай пры лячэнні апорна-рухальнага апарату, перыферычнай нервовай сістэмы, некаторых сардэчна-сасудзістых і іншых захворванняў.

Вядомыя ў Беларусі і серавадародныя воды. Яны выяўлены каля пасёлка Відзы на паўночным захадзе рэспублікі. Утрыманне ў іх серавадароду дасягае 50—60 міліграмаў на літр. Незвычайныя крыніцы параўнаўча слаба мінералізаваны. І таму прыдатныя не толькі для ваннаў, але і піцця. І калі пабудаваць каля Відзаў курорт, у многіх жыхароў рэспублікі адпала б патрэба ездзіць у Сочы-Мацэсту.

Наогул на тэрыторыі рэспублікі гідрагеолаг М. Казлоў вылучыў 11 тыпаў мінеральных вод. Многа і асабліва каштоўных, насычаных ёдам і бромам.

У сваіх разнастайных злучэннях і варыяцыях «жывыя» крыніцы могуць вылечваць самыя розныя хваробы. Галоўнае, правільна карыстацца такой гаючай вадой. Відаць, Фядоры Данілаўне такое вось майстэрства лячэння пад сілу,— заключыў гутарку Кудзельскі.

Тлумачэнні прафесара некалькі высветлілі сітуацыю, але поўнасцю мяне не задаволілі. Чаму ж тады лепшыя курорты свету з'яўляюцца бяссільнымі перад хваробай, а ў Конюхавай, мяркуючы па расказах, ажываюць на вачах людзі, якія прайшлі і праз бальніцы, і праз курорты? Прафесар задумаўся, але пэўнага адказу не даў. Выказаў толькі сваё меркаванне:

— Магчыма, справа ў веры хворых у Фядору Данілаўну, яе магчымасць вылечыць. Яшчэ ж Гіпакрат казаў, што надзея і вера напалавіну аздараўляюць нямоглага. Але тое ўжо не мая сфера.

Неўзабаве звязаўся з Аддзелам тэарэтычных праблем Акадэміі навук СССР. Апрача іншых «сур'ёзных» навук, тут займаюцца і зусім маладой і «несур'ёзнай» — псіхатронікай.

Да бялыніцкай Фядоры Конюхавай лабараторыі аддзела яшчэ не дабраліся. Але беларуская гісторыя ім не ў навіну. На думку вучоных, Конюхава — біятэрапеўт з народа. І лечыць не столькі «жывою» вадою, колькі (прафесар Кудзельскі інтуітыўна не памыляўся) актыўным уплывам на мозг хворага чалавека. Сама лекарка гаварыла шматлікім субяседнікам, што імкнецца перадаць здаровую энергію: унушае, пераконвае — не бойся, каханенькі-родненькі, ажывеш, паднімешся.

Маскоўскія вучоныя лічаць, што ад такіх электрызуючых зносін мозг узбуджаецца і пачынае процідзейнічаць хваробе.

Амерыканскі фізік Стэфан Шварц ужо шмат гадоў вывучае ўплыў экстрасенсаў на ваду і на багатым статыстычным матэрыяле засведчыў: яна мяняе спектральныя характарыстыкі. Калі ісці за яго логікай, вынікае, што «жывая» вада ў цудадзейных руках Фядоры Данілаўны мяняе свой састаў і становіцца яшчэ больш актыўнай і гаючай.

«ШУМНЫ ДУХ» З БАРЫСАВА

...Летам мінулага года ў доме сям'і Клімашонкаў з Барысава пачало тварыцца штосьці неверагоднае. Па хаце раптам пачалі лятаць талеркі, іншы посуд. Стралой пікіраваў парасон. Яго дзюбка цэлілася ў галовы гаспадароў, але, не даляцеўшы да чалавека некалькі крокаў, парасон падаў на зямлю. З электралічыльніка адна за адной выляталі засцерагальныя пробкі. Толькі яе закруцяць — глядзіш, сама выкручваецца і нясецца праз акно, дзверы на вуліцу з хуткасцю артылерыйскага снарада. Ды не раз, два, а дзень за днём. Гаспадарам настолькі надакучылі «страляючыя» пробкі, што асцерагаліся ўстаўляць іх у электралічыльнік. Сядзелі без святла. Але гэта — «кветачкі». «Ягадкі» ўбачылі гаспадыня дома з суседкай. Стаялі абедзве жанчыны, размаўлялі. Раптам — глухі стук, і побач з імі на цэментную дарожку каля прызбы апускаецца патэльня з блінцамі, накрытая талеркай, каструля з супам і чайнік.

Ёсць ад чаго здзівіцца. Ці не праўда? Абедзве жанчыны за хвіліну перад гэтым былі на кухні, сваімі вачамі бачылі на газавай пліце некрануты посуд з абедам. У той хаце, здаецца, не было старонніх дарослых людзей ці дзяцей, якія б маглі гэтак пажартаваць. У доме Клімашонкаў усё змяшалася. Адбываліся самыя неверагодныя выпадкі: падала люстэрка, раскрываліся ложкі, і коўдра з падушкамі ляталі па хаце. Карацей, многія рэчы хатняга ўжытку беспрычынна пачыналі рухацца. Ці была зроблена якая шкода? Не. За ўвесь час не разбілася ніводнай талеркі альбо шклянога слоіка.

Барысаўская міліцыя наконт інцыдэнта ў доме Клімашонкаў завяла цэлую справу. Вялі яе самыя вопытныя мясцовыя шэрлак-холмсы. Але што дакажаш, каго зловіш? Хіба што «нячыстую сілу»?

Адно толькі барысаўскія міліцыянеры зафіксавалі дакладна: ніякага злога жарту, наўмыснага дзеяння з мэтай прычынення шкоды Клімашонкам не было. Ніякіх правакацый не рабілі і самі гаспадары. Дык што ж тады за «нячысцік» завёўся ў Барысаве?

У знаёмым ужо нам Аддзеле тэарэтычных праблем Акадэміі навук СССР гэту з'яву трактуюць як палтэргейст, або ў перакладзе з нямецкай мовы — «шумны дух».

Барысаў не нейкі феномен у гэтай загадкавай прыроднай з'яве. Вучоныя, корпаючыся ў розных крыніцах, налічылі тысячы палтэргейстаў. Іх назіралі яшчэ ў старажытныя часы. Толькі замест электрапробак у паветры насіліся свечкі або лямпы. Як жа тады чалавеку было не паверыць у незямныя сілы? І да сённяшняга часу падобная з'ява да канца не вывучана і таму не з'яўляецца поўнасцю зразумелай. Налічваецца звыш 20 гіпотэз, якія спрабуюць растлумачыць палтэргейст. У асноўных з іх сцвярджаецца: «шумны дух» — складаны комплекс вядомых ці яшчэ невядомых навуцы фактараў. Даследчыкі прыводзяць аналогіі палтэргейства з шаравой маланкай. У адной і другой з'явы ёсць некаторыя сходныя фізіка-тэхнічныя характарыстыкі. І таму вядомыя ў навуковых колах вучоныя акадэмікі В. Трапезнікаў, Ю. Кобзараў і іншыя выказваюцца за шырокія даследаванні з'явы з выкарыстаннем прыбораў, пастаноўкай эксперыментаў. «Шумны дух» жыве ў фізічнай прасторы. І электрапробкі ў Барысаве ляталі з пэўнай сілай і частатой. Крыху больш святла на таямнічую з'яву праліваюць доследы ленінградскіх вучоных. Яны змералі магнітныя электрычныя палі, ствараемыя рукамі некаторых экстрасенсаў. Напружанне палёў было даволі вялікім. Адзін са звышадчувальных людзей стварыў поле, у якім маглі рухацца лёгкія прадметы. Такія з'явы вучоныя тлумачылі існуючымі законамі электрадынамікі і акустыкі.

Але ці тлумачацца гэтымі законамі барысаўскія падзеі? Гэтага мы не можам сказаць. Не бяруць на сябе такой смеласці і субяседнікі з АН СССР. Няма падстаў далучаць да атрада экстрасенсаў і кагосьці з гаспадароў барысаўскага дома. Праверыць і даказаць штосьці на практыцы таксама позна. Як паведамілі аўтару прадстаўнікі барысаўскай міліцыі, таямнічыя з'явы ўжо зніклі і больш не паўтараюцца. А вучоныя выказваюць гіпотэзу за гіпотэзай. Аднак таямнічыя з'явы накшталт барысаўскай, не знікаюць зусім. Наадварот, ствараецца ўражанне, што яны пачасціліся. І вучоныя падыходзяць да думкі аб магчымасці перадачы нейкага новага спосабу інфармацыі, зносін. І гэты спосаб, відаць, і дапаможа растлумачыць пакуль яшчэ загадкавыя з'явы.

Вось чаму ў Аддзеле тэарэтычных праблем акадэміі створана міжнародная праграма па экстрасенсах і іншых ашаламляючых праблемах. Вучоныя імкнуцца зразумець пакуль што дзіўныя для ўсіх з'явы і затым выкарыстаць іх на карысць усяму чалавецтву.

ПРАКТЫЧНАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ

У ЦЭНТРЫ ДЫСКУСІЙ — ЧАЛАВЕК

Працэс перабудовы непарыўна звязаны з пераглядам ранейшых цэнасных арыенціраў грамадства і асобы. На якой метадалагічнай аснове працягваць пачатыя пераўтварэнні? Якія праблемы духоўнага абнаўлення сацыялізму і перспектывы радыкальнай эканамічнай рэформы? У чым асаблівасці дэмаграфічнага развіцця краіны? Пошук адказаў на гэтыя і іншыя пытанні, асэнсаванне набытага вопыту правялі ўдзельнікі Усесаюзнай навукова-практычнай канферэнцыі «Дыялектыка. Перабудова. Чалавек» у Мінску. Размова, пачатая на пленарным пасяджэнні, працягвалася ў дыскусіях на секцыях. Вось выказванні некаторых вучоных:

У. Давідовіч, доктар філасофскіх навук, загадчык кафедры Растоўскага універсітэта:

— У цэнтры дыскусіі, разгорнутай на секцыі «Філасофскія і сацыякультурныя праблемы чалавека», знаходзяцца пытанні, што хвалююць, без перабольшання, кожнага з нас. Гэта перш за ўсё гуманізацыя грамадскага жыцця, паварот увагі да рэальнага чалавека, пошук тых аптымальных варыянтаў, якія дапамаглі б ажыццявіць гэтыя генеральныя задачы. На секцыі ішоў, прычым вельмі актыўна, пошук новых сучасных філасофскіх паняццяў, што даюць магчымасць адарвацца ад дагматычнага падыходу да марксізму.

На мой погляд, «чалавечы фактар» ярка праявіўся ў выступленнях многіх нашых калег. У іх дадзены глыбокі аналіз месца чалавека ва ўмовах навукова-тэхнічнай рэвалюцыі, пабудовы такога яго вобраза, які зможа эфектыўна дзейнічаць у працэсах абнаўлення грамадства. У мінулым гэты вобраз ствараўся вельмі схематычна, што значна ўскладніла нам вырашэнне многіх праблем сённяшняга дня.

Здзіслава П'ентэк, дацэнт Кракаўскага універсітэта (ПНР):

— Мне, спецыялісту па генетыцы, канферэнцыя дала, як я пераканалася, масу матэрыялу. Бо не сакрэт, што біялагічная навука ўсё больш патрабуе філасофскага асэнсавання яе дасягненняў, іх уплыву на чалавека і цывілізацыю ў цэлым. У Мінску я ўбачыла зусім новы падыход савецкіх калег да многіх пытанняў, на якія раней распаўсюджвалася «фігура змаўчання».

Мяне даўно хвалюе праблема сумяшчальнасці эвалюцыі культуры і біялогіі. Тут я ўзяла мноства прыкладаў таго, на што трэба зрабіць акцэнты ў рабоце над гэтай тэмай.

КРУГЛЫ СТОЛ „ГОЛАСУ РАДЗІМЫ“

КАЛІ ВЫ ЗБІРАЕЦЕСЯ ДА НАС...

Надыходзіць лета — час водпускаў, падарожжаў, паездак да сяброў, родных і блізкіх. Збіраюцца наведаць сваю Радзіму і многія нашы суайчыннікі, якія жывуць у розных краінах. Пра гэта яны напісалі ў сваіх лістах у рэдакцыю. Яны таксама ставяць цэлы шэраг пытанняў, якія тычацца магчымасцей наведання розных гарадоў, турыстычнага абслугоўвання ў Беларусі, паездак да родных, таможных і іншых правілаў для замежных грамадзян. Каб адказаць на іх, мы запрасілі ў рэдакцыю «Голасу Радзімы» начальніка Беларускага ўпраўлення Дзяржаўнага камітэта па замежнаму турызму СССР Вячаслава ІВАНОВА, намесніка начальніка Аддзела віз і рэгістрацый Упраўлення ўнутраных спраў Мінгарвыканкома (АВІР) Уладзіміра МАТУСЕВІЧА і начальніка Беларускай тэрытарыяльнай таможні Пятра КРЭЧКО.

— Большасць пытанняў у пісьмах суайчыннікаў тычацца магчымасцей наведвання сваякоў у розных гарадах і вёсках Беларусі. Таму першае пытанне да вас, Уладзімір Міхайлавіч. Што неабходна зрабіць, каб ажыццявіць такую паездку?

— Перш за ўсё хачу адзначыць, што за апошнія два гады ў гэтым пытанні адбыліся значныя змяненні. Калі раней з боку замежных грамадзян, якія жадалі наведаць нашу краіну па прыватных справах, мелася нямала нараканняў на доўгія тэрміны і складанасць працэдуры афармлення дакументаў на паездку, то цяпер іх, можна сказаць, няма зусім. Гэта рэальны плён перабудовы, што адбываецца ў нашай краіне, дэмакратызацыі нашага грамадства. Ужо больш двух гадоў дзейнічае Пастанова Савета Міністраў СССР «Аб унясенні дапаўненняў у Палажэнне аб уездзе ў Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік і аб выездзе з Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік». У адпаведнасці з ім адбыліся вялікія змяненні адносна ўезду ў нашу краіну і знаходжання ў ёй замежных грамадзян. Для тых, хто мае сваякоў у нашай рэспубліцы, прыехаць да іх у госці цяпер не складае асаблівай праблемы. Яны атрымліваюць афіцыйнае запрашэнне ад родных у БССР, звяртаюцца з ім у бліжэйшае савецкае консульства ў сваёй краіне, і там у кароткі тэрмін ім афармляюць усе неабходныя дакументы. Можна звяртацца за дазволам на паездку да сваякоў, і не маючы запрашэння ад іх. У гэтым выпадку працэдура афармлення крыху іншая, але ўсё роўна не займае многа часу. Дарэчы, калі раней можна было наведваць родных раз у год, то цяпер колькасць паездак не абмяжоўваецца. Дадам яшчэ некалькі слоў, што не тычацца непасрэдна вашага пытання. Тым не менш, думаю, гэта будзе цікава для нашых замежных суайчыннікаў. Цяпер вельмі хутка развіваецца міжнароднае супрацоўніцтва. Нямала нашых суайчыннікаў працуе ў фірмах, якія маюць дзелавыя сувязі з нашай краінай і ўдзельнічаюць у ажыццяўленні розных сумесных праектаў на нашай тэрыторыі. Прадстаўнікам такіх фірм выдаюцца шматразавыя візы. Гэта значыць, ім не трэба кожны раз звяртацца за дазволам на паездку дамоў і вяртанне назад.

— Многія нашы суайчыннікі, што жывуць за мяжой, з'яўляюцца савецкімі грамадзянамі. Ці існуюць адрозненні ў правілах уезду ў краіну для гэтай катэгорыі асоб у параўнанні з іншымі замежнымі грамадзянамі?

— Працэдура афармлення дакументаў на ўезд істотна не адрозніваецца, хаця часцей за ўсё гэтыя людзі не карыстаюцца запрашэннямі ад сваякоў, а самі падаюць заявы ў консульствы. Іх там, у асноўным, ведаюць па папярэдніх паездках, і выдача дакументаў адбываецца ў кароткі тэрмін. Пасля прыезду да нас яны маюць права свабодна перамяшчацца па тэрыторыі краіны, акрамя тых месцаў, на ўезд у якія ўсім грамадзянам СССР неабходна атрымаць спецыяльны дазвол. Калі асобы такой катэгорыі прыбываюць на тэрмін да 45 сутак, то ім нават не трэба прапісвацца. Дарэчы, цяпер даволі многа шлюбаў савецкіх грамадзян з іншаземцамі. Часта члены такіх сямей жывуць асобна, кожны ў сваёй краіне. І грамадзяне СССР, у якіх муж, жонка альбо іншыя блізкія сваякі жывуць за мяжой, маюць права свабодна ехаць туды. Цяпер выязныя дакументы сапраўдныя на 6 месяцаў, і на працягу гэтага часу колькасць паездак не абмяжоўваецца, гэта значыць, можна ездзіць па адных дакументах некалькі разоў.

— Уладзімір Міхайлавіч, многіх нашых суайчыннікаў хвалюе пытанне аб магчымасці прыезду да іх сваякоў з нашай краіны. Што вы можаце сказаць наконт гэтага?

— Тут таксама за апошнія два гады шмат что спрасцілася. Цяпер многія савецкія грамадзяне выязджаюць за мяжу па прыватных справах. І не толькі ў госці да родных, але і да сяброў, проста знаёмых у іншых краінах. Для атрымання дакументаў на такую паездку неабходна запоўніць невялікую анкету з 5—7 пытанняў, заверыць яе на рабоце і прыкласці да яе запрашэнне. Раней такія анкеты мелі амаль 30 пытанняў.

— І ўсё ж іншы раз мы атрымліваем скаргі на тое, што сваякоў не выпускаюць за мяжу. Вось зусім нядаўна прыйшло даволі сярдзітае пісьмо Таццяны Дубанавай з Канады, якая піша, што яе цётцы і сястры састарэлага бацькі Марыі Дубанавай з Віцебска доўгі час не дазваляюць прыехаць да іх у госці. Ёсць скаргі і на тое, што некаторыя замежныя суайчыннікі не змаглі трапіць да родных тут, у Беларусі.

— Я, вядома, не змагу адказаць канкрэтна на скаргу Таццяны Дубанавай. Яе сваячка пражывае ў Віцебску, і разбірацца трэба там на месцы. Але магу пацвердзіць, што, як і ва ўсіх іншых краінах, абмежаванні на выезд ёсць і ў нас. Напрыклад, выезд па прыватных справах грамадзяніну СССР не дазваляецца, калі ён валодае якімі-небудзь дзяржаўнымі сакрэтамі ці маюцца іншыя прычыны, што закранаюць бяспеку дзяржавы. У кожным выпадку трэба разбірацца асобна. Могуць быць скаргі, звязаныя з затрымкай выдачы дакументаў. Але на гэта існуюць аб'ектыўныя прычыны. Паток выязджаючых за мяжу па прыватных справах вельмі рэзка ўзрос, а нашы штаты засталіся ранейшымі. Мы стараемся гэтую праблему вырашаць, збіраемся нават залучаць для афармлення дакументаў раённыя Бюро добрых паслуг, створаны аддзяленні АВІР у раёнах горада, будзе цэнтралізавана праводзіцца далейшая працэдура спрашчэння афармлення дакументаў. Так, нашы грамадзяне будуць ездзіць у сацыялістычныя краіны па свайму агульнаграмадзянскаму пашпарту з укладышам. Будуць прымацца і іншыя меры, каб гэтую праблему зняць. Дарэчы, я часткова падышоў да адказу і на другую частку вашага пытання. З тымі замежнымі грамадзянамі, хто загадзя аформіў дакументы на наведанне сваякоў яшчэ ў сябе дома, ніякіх пытанняў не ўзнікае. Аднак ёсць выпадкі, калі суайчыннік прыязджае ў складзе турыстычнай групы і за некалькі дзён, што ён знаходзіцца ў Мінску, хоча яшчэ з'ездзіць да сваякоў у вёску. Вось тут усё значна складаней. «Інтурыст» адказвае за кожнага свайго госця ў нашай краіне. Таму любое адхіленне ад маршруту павінна афармляцца праз гэтую арганізацыю.

— Мы ўжо закранулі і пытанне аб «Інтурысце». Не маглі б цяпер вы, Вячаслаў Віктаравіч, больш падрабязна спыніцца на рабоце Беларускага ўпраўлення Дзяржаўнага камітэта па замежнаму турызму СССР?

— Пачну з агульнавядомай ісціны: турызм служыць умацаванню дружбы і ўзаемаразумення паміж народамі. Гэта яго галоўная задача. Але турызм прыносіць і немалы даход тым, хто ўмее яго добра арганізаваць. На жаль, пакуль мы не можам пахваліцца, што наблізіліся да вядучых турыстычных дзяржаў свету. Гэта не трэба разумець так, што ў нас дрэннае абслугоўванне ці няма чаго паказаць турыстам. Уся бяда, што мы проста не ў стане прыняць усіх, хто хоча пабываць у нашай рэспубліцы. А колькасць такіх людзей за апошнія чатыры гады ўзрасла ў некалькі разоў. Перабудова, палітыка публічнасці і адкрытасці выклікалі вялікую цікавасць да нашай краіны і Беларусі, у прыватнасці. А мы пакуль маем дзве ўласныя гасцініцы, матэль і кемпінг у Мінску і гасцініцу ў Брэсце. Гэтага яўна недастаткова.

Затое мы можам пахваліцца тым, што турысты, якія трапляюць у Беларусь, ніколі не пакідаюць нас расчараванымі. Наадварот, яны рэкамендуюць прыехаць сюды сваім сябрам, многія самі не раз паўтараюць гэтую паездку. Нашых гасцей чакаюць цікавыя турыстычныя праграмы, добрыя ўмовы пражывання, адметная беларуская кухня.

— Ці адрозніваюцца ад звычайных тыя праграмы, якія вы прадастаўляеце тургрупам суайчыннікаў?

— Так, крыху адрозніваюцца. Такія групы мы прымаем сумесна з Беларускім таварыствам «Радзіма» і ў кожным канкрэтным выпадку ўлічваем запатрабаванні гасцей, якія звычайна загадзя паведамляюць, што хочуць паглядзець. Дадам: «Інтурыст» аказвае Беларускаму таварыству «Радзіма» вялікую дапамогу ў прыёме дэлегацый, абслугоўванні розных мерапрыемстваў. Напрыклад, мы дапамагаем у правядзенні курсаў павышэння кваліфікацыі кіраўнікоў калектываў мастацкай самадзейнасці прагрэсіўных арганізацый суайчыннікаў за мяжой, курсаў па вывучэнню беларускай гісторыі і культуры. Карыстаючыся выпадкам, хачу сказаць нашым замежным землякам, што і тым, хто прыязджае ў Беларусь па прыватных візах, «Інтурыст» можа аказаць нямала паслуг. Гэта арганізацыя розных экскурсій, наведанне тэатраў і канцэртаў, нашага культурнага цэнтра. Вядома ж, гэтыя і многія іншыя дадатковыя паслугі і ў распараджэнні нашых турыстаў, аж да аказання дапамогі, як ужо гаварылася, у атрыманні дазволу на наведанне родных у вёсках і арганізацыі самой паездкі.

— Дарэчы, аб гэтай апошняй паслузе. Мне не раз даводзілася чуць ад замежных суайчыннікаў, што за дапамогу ў атрыманні візы на паездку да сваякоў «Інтурыст» бярэ вельмі вялікія грошы. Гавораць таксама, што ўвогуле цэны «Інтурыста» высокія. Ці так гэта?

— Не зусім, нават зусім не так. За дапамогу ў атрыманні дазволу мы нічога не бяром. Але справа ў тым, што наша арганізацыя камерцыйная, натуральна, нашы паслугі платныя. Акрамя таго, каб поўнасцю праясніць сітуацыю, скажу, што з моманту прыбыцця ў нашу краіну мы нясём поўную адказнасць за кожнага турыста, яго здароўе і бяспеку. І калі з ім здарыцца які-небудзь няшчасны выпадак па нашай віне, асабліва далёка ад агаворанага з фірмай-партнёрам маршруту, то нам прыйдзецца выплачваць вельмі вялікую кампенсацыю. Таму мы адпраўляем іх туды на сваёй машыне і нехта з нашых супрацоўнікаў суправаджае госця. Нярэдка маршрут туды і назад складае 500—600 кіламетраў. Вядома, ім даводзіцца за гэта плаціць, а такі прабег плюс аплата шафёра і суправаджаючага сапраўды складаюць значную суму, але намнога меншую, чым гэта каштавала б у краінах Заходняй Еўропы ці ў ЗША, напрыклад.

— Яшчэ адно пытанне, Вячаслаў Віктаравіч. Большасць нашых суайчыннікаў ужо не раз бывала тут і добра знаёма з традыцыйнай турысцкай праграмай. Што новага зможаце вы ім прапанаваць у гэтым годзе?

— Непадалёку ад Мінска адкрываецца музей беларускага народнага дойлідства. З'явіліся новыя турысцкія маршруты: Гродна — Вільнюс — Мінск — Брэст; Мінск — Віцебск — Магілёў — Мінск; Мінск — Гомель. Адкрываем у бліжэйшай будучыні турыстычныя цэнтры ў такіх старажытных гістарычных гарадах Беларусі, як Навагрудак і Нясвіж. Спадзяюся, нашых замежных землякоў гэта зацікавіць.

— Час ад часу ў нашых замежных гасцей узнікаюць непрыемнасці на таможні. Як нам здаецца, тлумачыцца гэта, у асноўным, няведаннем імі таможных правілаў. Дарэчы, нядаўна ў іх адбыліся значныя змяненні... Таму просім ужо вас, Пётр Васільевіч, даць неабходныя тлумачэнні наконт гэтага.



— Хачу напомніць, што з 1 лютага 1989 года былі ўведзены ў дзеянне новыя правілы па абмежаванню вывазу асобных тавараў народнага спажывання з СССР.

Гэтымі Правіламі прадугледжана, што грамадзянам, якія пастаянна жывуць за мяжой і знаходзяцца ў СССР у якасці турыста і па асабістых справах, у тым ліку па запрашэнню асоб, якія пастаянна пражываюць у СССР, забаронены вываз адсюль: кавы натуральнай і растварымай, ікры асятровых і лососевых рыб, тэлевізараў каляровага і чорна-белага адлюстравання, халадзільнікаў, мараз-ільнікаў, пральных машын, швейных машын, дзіцячага адзення і абутку. Шэраг тавараў бытавога прызначэння, такіх, як электрапылососы, кандыцыянеры, электрасамавары і да т. п., усяго 38 назваў, прапускаецца пры вывазе толькі па аднаму прадмету кожнай назвы на адну асобу і толькі з аплатай таможнай пошліны ў памерах, указаных у спісе. Замежныя госці, хто прыбывае ў нашу краіну, могуць азнаёміцца з гэтым спісам у любой савецкай таможні. За выключэннем вышэйназваных, агульны кошт купленых прадметаў і падарункаў, уключаючы ювелірныя вырабы, якія прапускаюцца бяспошлінна на адну асобу ўказанай катэгорыі, не павінен перавышаць 100 рублёў па рознічных дзеючых у СССР цэнах. Калі замежны грамадзянін набывае тавары народнага спажывання ў спецыялізаваным магазіне на замежную валюту, то такія тавары прапускаюцца бесперашкодна, але пры наяўнасці таварных чэкаў гэтых магазінаў.

Пры ўездзе па запрашэнню асоб, пастаяна пражываючых у СССР, грамадзяне сацыялістычных краін могуць увозіць падарункі агульным коштам да 500 рублёў.

Грамадзянам іншых дзяржаў дазволена ўвозіць падарункі агульным коштам да 300 рублёў па дзеючых у СССР рознічных цэнах.

Тая частка падарункаў, агульны кошт якіх перавышае 500 ці адпаведна 300 рублёў, можа быць прапушчана з аплатай таможнай пошліны.

Інфармуючы аб некаторых таможных правілах, хачу нагадаць, што калі ў замежных грамадзян, якія прыбываюць да нас, узнікаюць якія-небудзь пытанні, звязаныя з парадкам вывазу розных тавараў, яны могуць папярэдне звярнуцца ў бліжэйшую таможню і атрымаць кансультацыю па гэтых пытаннях.

— Хачу падзякаваць усім вам за ўдзел у нашай гутарцы. Спадзяюся, што нашы чытачы атрымалі поўныя адказы на свае пытанні і гэта значна аблегчыць ім клопаты з прыездам у Беларусь.

Вёў гутарку
Рыгор ФАМЕНКА.

СОВЕТСКИЙ СОЮЗ НА ПУТИ К ОТКРЫТОЙ ЭКОНОМИКЕ

НЕОПРЕДЕЛЕННЫЕ ПЕРСПЕКТИВЫ

Проблема «вписывания» Советского Союза в мировую экономику имеет много аспектов. Касаются они и самой экономики (отраслевой структуры хозяйства в целом, ее экспортного сектора, уровня конкурентоспособности), и экономической политики, «состыковки» внутреннего хозяйственного механизма с мировой практикой внешнеэкономической деятельности.

В этом контексте актуален и вопрос об отношении СССР к таким регуляторам международных валютно-финансовых связей, как Международный валютный фонд (МВФ) и Международный банк реконструкции и развития (МБРР). Следует ли Советскому Союзу вступать в эти две международные организации, предпринимаются ли практические шаги по сближению с ними? Вот что рассказал в связи с этим начальник международных экономических отношений МИД СССР профессор Эрнест Обминский.

Обе эти организации, как известно, были созданы во второй половине 1944 года, когда стало ясно: гитлеровский фашизм будет повержен. Не дожидаясь окончания войны, союзники приступили к выработке условий взаимоотношений в послевоенном мире, в том числе в экономической и валютно-финансовой сфере. В американском городе Бреттон-Вудсе состоялась конференция, где обсуждались вопросы функционирования международной валютно-финансовой системы. В ее работе активно участвовал и Советский Союз. И надо признать, что в то время его перспективы в этих специализированных учреждениях системы ООН выглядели привлекательно. СССР выделялась квота в 1,2 миллиарда долларов, что соответствовало 12,37 процента голосов. Мы были бы третьими после США и Англии. Кроме того, предусматривались изъятия в уставах этих учреждений, учитывающие особенности (нерыночной) экономики, в случае нашего участия. Однако в то время вопрос о вступлении в МВФ и МБРР был, к сожалению, решен в Москве отрицательно.

Советская сторона считала, что ООН, членом которого стал СССР, располагает необходимым инструментарием для решения всех вопросов международного взаимодействия, в том числе и в сфере экономики. Но жизнь показала, что это далеко не так. Дело в том, что резолюции Генеральной Ассамблеи ООН носят лишь рекомендательный характер, тогда как уставы МВФ и МБРР предусматривают обязательность принятых решений, взвешенное голосование по вопросам, касающимся непосредственного выделения финансовых и валютных средств.

Заняв с самого начала отрицательную позицию, мы с тех пор как бы не замечаем существования ни фонда, ни банка. Объяснялось это конфронтационной линией в отношениях между Востоком и Западом. Сегодня картина меняется. Вопрос об участии СССР в международных экономических организациях возник в связи с новым мышлением. Позиция советской стороны ясна — мы идем на сближение с мировой экономикой, в частности с ее валютной и финансовой системой. При этом, меняя свою позицию в отношении фонда и банка, мы отдаем себе отчет в том, что эти организации не ангелы, мы знаем их отрицательные качества, многие недостатки. Они не идеальные регуляторы мирового хозяйства. Но они существуют. Это реальные рычаги воздействия на мировую валютно-финансовую ситуацию.

И тем не менее у нас нет однозначного подхода к вопросу о вступлении в фонд и банк.

Думается, что пугаться участия СССР в МВФ и МБРР не следует. Ведь их членами уже являются некоторые социалистические государства — Венгрия, Польша, Румыния, КНР, Вьетнам.

Было бы неправильно сводить членство Советского Союза в фонде и банке с получением кредитов или каких-то других финансовых выгод. Дело не в кредитах. СССР их и так имеет, поскольку является первоклассным заемщиком. Более того, ему их усиленно предлагают отдельные страны. Вопрос состоит в том, чтобы успешнее интегрироваться в мировую экономическую систему. С помощью банка и фонда это сделать будет легче. Кроме того, мы заинтересованы иметь более полное представление о развитии всей мировой валютной и финансовой ситуации. И, наконец, мы полагаем, что членство в МВФ и МБРР поможет развитию собственной экономики, даст возможность получить дополнительные стимулы для перестройки своей несовершенной финансовой системы, для развития товарно-денежных отношений.

Что касается перспектив вступления в фонд и банк, то они на сегодняшний день неопределенные. Советский Союз уже неоднократно заявлял о своем позитивном отношении к развитию контактов и с МВФ, и с МБРР. Реакция на советские намерения была неоднозначной. Правда, официальной заявки на вступление мы не подавали. Тем не менее, невзирая на это, официальные представители прежней администрации США поспешили заявить о своей негативной реакции на случай, если такая будет подана. Это серьезный фактор, с которым нельзя не считаться, поскольку США могут наложить вето на наше вступление. Почему они занимают такую позицию? Вопрос этот в большой степени политизирован. Американцы откровенно опасаются, что участие СССР в фонде и банке изменит всю сложившуюся структуру и внесет дисбаланс в отношения внутри этих организаций. Думаю, что они заблуждаются. Но как бы то ни было, должен сказать, что мы имеем и с фондом, и с банком неформальные контакты и вполне удовлетворены их развитием.

Что касается выгод участия СССР в МВФ и МБРР, то совершенно точно могу сказать, что и плюсы и минусы есть, мы такой проблемой занимались. Многое зависит от того, какой в результате переговоров мы получим статус. Здесь потребуется выполнить ряд требований фонда, в частности опубликовать наш платежный баланс. Но этот вопрос не относится к разряду неразрешимых. Куда более серьезны проблемы экономических выгод. Но именно поэтому мы и должны вступить в переговоры, чтобы прояснить картину.

Многое еще разделяет валютно-финансовые учреждения Бреттон-Вудса и Советский Союз. Но, исходя из общей концепции преодоления конфронтации и политической напряженности во всех ее видах и проявлениях, СССР не видит непреодолимых препятствий к сотрудничеству. Набившие оскомину доводы о «несовместимости» систем и невозможности в силу этого полноценного участия СССР во всемирном хозяйстве все более теряют всякий смысл. Это относится и к перспективам вхождения Советского Союза в международные экономические организации, включая МВФ и МБРР.

Юрий МАКСИМОВ.

ТАДЖИКИСТАН: ВОКРУГ ЗАКОНА О ЯЗЫКЕ

БЕЗ ЭМОЦИЙ И ПРИСТРАСТИЯ

В СЛЕД за Прибалтийскими республиками Советского Союза проблему о статусе государственного языка решает Таджикистан — одна из союзных республик Средней Азии.

В январе нынешнего года начала работу комиссия Президиума Верховного Совета Таджикской ССР, которую возглавил председатель Президиума Гаибназар Паллаев. Языковеды, юристы, литераторы, представители общественности рассмотрели предложения, адресованные правительству республики и ставящие вопрос о статусе таджикского языка. Вывод, сделанный комиссией: нет никаких правовых или политических препятствий тому, чтобы придать таджикскому языку статус государственного.

Параллельно с главным выводом комиссия отмечает, что необходимо также принять соответствующие законодательные акты о форме применения и функционирования других языков, обеспечения гарантии их свободного развития. Из этих же сообщений, опубликованных в республиканских газетах, можно понять, что уже завершена (или в скором времени завершится) работа над проектом Закона Таджикской ССР о языке, который будет опубликован для обсуждения.

«На заседании комиссии отмечалось,— пишет газета «Коммунист Таджикистана»,— что открытое обсуждение данного вопроса должно вестись с высоким чувством гражданской ответственности. Не должно быть места эмоциям и пристрастиям, создающим ненужную напряженность. Нельзя допустить, чтобы возможности, открытые демократизацией и гласностью, использовались для подогревания межнациональной неприязни.

Видимо, уважаемая комиссия знает, что говорит, выступая с такими призывами, хотя страсти, если они и кипят вокруг языковой проблемы, охватывают какие-то срединные и верхние этажи общества. На нижних достаточно спокойно: около 70 процентов населения республики живет на селе, а там языковой проблемы в ее «городском» варианте не существует, лингвистическая среда достаточно однородна. Но вот слухов возникает предостаточно. Вплоть до того, что поговаривают о каком-то насильственном обучении таджикскому языку тех, кто его не знает. «Может быть, нам пора уже укладывать чемоданы?» — спрашивают некоторые русские, украинцы, татары, чуваши, евреи, осетины, немцы и представители ряда других национальностей (всего их в республике более 80).

Несколько иначе формулируют подобный вопрос работники проектного института «Таджикгипрострой», также обратившиеся с письмом в газету «Коммунист Таджикистана». «Мы не знаем,— пишут 109 человек, поставивших под этим письмом свои подписи,— возможно ли будет так же свободно работать, жить и общаться, если будет принят государственным таджикский язык».

Материалы — статьи специалистов и письма дилетантов — о языковой проблеме за последнее время все чаще появляются на страницах газет. Самое значительное их число публикует из номера в номер еженедельник «Адабиет ва сан'ат» («Литература и искусство»), причем большинство исподволь или явно пронизано уверенностью в том, что придание таджикскому языку статуса государственного — дело предрешенное. Есть и прямые ссылки на «прибалтийский прецедент». Лишь изредка можно встретиться с конструктивным подходом к языковой проблеме, а если уж смотреть на вещи шире, то ограниченность применения языка и неизбежная по этой причине его бытовая приземленность, искусственные препоны на пути языкового совершенствования — все эти проблемы присущи в достаточной мере и другим языкам, бытующим в республике, в том числе и русскому.

Что касается лично меня, прожившего в Таджикистане более 30 лет, то я готов присоединиться к мнению доктора филологических наук, члена научного совета «Язык и общество» отделения языка и литературы Академии наук СССР Рахима Хашимова. Он, в частности, предлагает придать таджикскому языку статус средства межнационального общения народов республики. Ссылаясь на опыт ООН, он также предлагает признать функционально равными, официальными рабочими языками при проведении различных собраний, конференций, съездов три наиболее распространенных в республике языка — таджикский, узбекский и русский, а в местах компактного проживания киргизов, казахов, татар, немцев, туркмен, памирских народностей — языки соответствующей национальной общности.

Юрий ЗЕММЕЛЬ.

ИССЛЕДУЕТСЯ ИНФЛЯЦИЯ

МАСШТАБЫ И ПРИЧИНЫ

Советские экономисты от общих рассуждений об инфляционных процессах в экономике переходят к их конкретным исследованиям. В частности, сотрудники института при Госплане СССР А. Шмаров и Н. Кириченко попытались определить темпы инфляции в потребительской сфере. «Попытались», потому что советская статистика не располагает данными о ценах на товары и услуги как на «черном рынке», так и у «новых кооператоров». К тому же свой вклад в инфляцию вносят и государственные предприятия — они довольно свободно оперируют понятием «качество» и зачастую произвольно повышают цены на практически не повысивший потребительских свойств товар либо по старой цене продают товар с заведомо ухудшившимся качеством.

Впрочем, и доступная исследователям статистика дает повод к достаточно серьезным размышлениям: если в 1981—1985 годах общий индекс инфляции в потребительском секторе экономики составлял 5,7 процента в год, то в 1986—1988 годах он вырос до 7 процентов (1988 год — 8,4 процента). Рос и так называемый «инфляционный сдвиг» — лишние деньги, поступающие в руки населения в большем количестве, чем выпускалось товаров или предлагалось услуг. Прирост этих «неденег» в прошлом пятилетии составлял 19,5 миллиарда рублей в год.

Инфляция, по мнению ученых, обесценила довольно значительный прирост денежных доходов населения (8,5 процента). Процесс падения покупательной силы денег они связывают прежде всего с увеличением продажи продуктов питания по ценам, превышающим государственные, — через потребительскую кооперацию, рынки. Это касается прежде всего мясо-молочных продуктов, дефицит которых в государственной торговле стал одной из наиболее острых проблем.

Отмечают ученые и рост цен на товары, традиционно покупаемые низкодоходными слоями населения: картофель (за последние три года — на 30 процентов), хлеб (на 25 процентов), детскую одежду и обувь (на 50 процентов).

Другим каналом проявления инфляции ученые считают формирование избыточных сбережений. Это стало возможно благодаря расширению круга людей, чьи заработки значительно увеличились в ходе перестройки — за счет работы по договорам, сотрудничеству с кооперативами и внедренческими центрами. На них-то и пришелся «потребительский бум» на телевизоры, мебель, автомобили, дорогую одежду и т. п., далеко не удовлетворенный рынком.

Особенности нового хозяйственного механизма — свобода планирования ассортимента продукции, свободное распределение дохода среди арендаторов и рост фондов материального поощрения на самоокупаемых предприятиях, появление кооперативов — привели в движение огромное количество наличных денег. «Инфляционный всплеск, — пишут А. Шмаров и Н. Кириченко, — является естественной реакцией рынка на отсутствие адекватной товарно-денежным отношениям системы экономического регулирования».

Понимая, что разработка такой системы займет немало времени, ученые в своей статье, опубликованной в еженедельнике «Экономическая газета», предлагают уже сейчас вводить меры компенсации для наименее защищенных от инфляции слоев населения — пенсионеров, студентов и других получателей твердых доходов. Например, ежегодные коэффициенты к доходам, восстанавливающие их реальное содержание. В принципе же исследователи считают необходимым как планирование неизбежных ценовых сдвигов, позволяющее создать систему прямого и косвенного компенсирования, так и установление минимума материальной обеспеченности, который должен стать основой этой компенсационной политики.

Полоса подготовлена по материалам АПН.

ПЕРАБУДОВА І ТВОРЧЫЯ САЮЗЫ

РАСЧАРАВАННІ, НАДЗЕІ

Гады перабудовы адзначаны прыкметнымі станоўчымі зрухамі ў савецкім мастацтве. Пра гэта можна меркаваць па новых цікавых працах пісьменнікаў, кінематаграфістаў, мастакоў, кампазітараў. Гэтыя ж гады мала адбіліся на дзейнасці творчых саюзаў, якія аб'ядноўваюць тых жа пісьменнікаў, кінематаграфістаў і кампазітараў. Застой тут, як гаворыцца, у наяўнасці.

Прычыны падобнай неадпаведнасці, на першы погляд, цяжка тлумачацца. Бо амаль усюды да кіраўніцтва саюзамі прыйшлі новыя людзі, якія актыўна і безагаворачна падтрымліваюць перабудову. Амаль усюды мяняецца да лепшага творчая атмасфера.

Аднак словы далёка не заўсёды ажыццяўляюцца. Добрыя намеры часта застаюцца на паперы.

Сумняваецца ў шчырасці новых кіраўнікоў творчых саюзаў няма ніякіх падстаў. Няма падстаў сумняваецца і ў прагрэсіўнасці, напрыклад, новай мадэлі кінематографа і тэатральнай рэформы. Тым не менш тармажэнне адчуваецца, як адчуваецца і «бюракратычная карозія».

Справа ў тым, што творчыя саюзы ў такім выглядзе, у якім яны дзейнічаюць сёння, па сутнасці, частка сталінскай адміністрацыйнай сістэмы, укаранёнай у 30-х гадах. Іх асноўная функцыя і сёння—кантроль і кіраванне. Кожны саюз—іерархічная лесвіца, піраміда: прэзідыумы, сакратарыяты, бюро, праўленні... Кожны саюз—свае чыноўнікі ад мастацтва.

Існуючая сістэма ўздзеяння на творчую інтэлігенцыю—перш за ўсё сістэма націску праз размеркаванне творчых і матэрыяльных даброт. Паслухмяныя мастакі атрымліваюць выгадныя заказы. Непаслухмяныя іх не атрымліваюць. Ад кіраўніцтва залежыць рашэнне аб прысваенні ганаровых званняў, аб уключэнні ў дэлегацыю, якая выязджае ў цікавую паездку за мяжу. Усе матэрыяльныя фонды саюзаў—літфонд, мастацкі фонд, музычны фонд—таксама падпарадкаваны сакратарыяту саюза.

Пакуль існуе такая структура, перабудова перамагчы ў творчых саюзах не зможа. Таму на парадку дня ломка старой сістэмы. І ў першую чаргу замена «вертыкальнага прынцыпу» падпарадкавання кіраўніцтву «гарызантальным прынцыпам» раўнапраўнага супрацоўніцтва, дзе жывапісцы, пісьменнікі, кінематаграфісты, кампазітары, акцёры, рэжысёры будуць аб'ядноўвацца ў своеасаблівыя гільдыі аднадумцаў па творчых прыхільнасцях.

Многія аўтарытэтныя дзеячы савецкай культуры перакананы, што сёння творчы саюз павінен стварацца па прынцыпу свабоднай асацыяцыі. Гэта павінен быць саюз, у якім маглі б свабодна суіснаваць самыя розныя стылі і напрамкі. Не толькі сацыялістычны рэалізм, але і сацыялістычны рамантызм. І проста рамантызм, імпрэсіянізм, абстракцыянізм.

Сёння не толькі адчуваецца патрэба ў стварэнні творчых арганізацый новага тыпу, але і пачынаецца іх стварэнне.

Першымі пачалі ажыццяўляць ідэю новага саюза кінематаграфісты. Тут ужо ўзніклі самастойныя асацыяцыі (акцёраў, рэжысёраў). Гэтыя базавыя творчыя падраздзяленні павінны «разгрузіць» сакратарыят, размеркаваць, дакладней, перараздмеркаваць цяжар улады раўнамерна па ўсёй арганізацыі. Цэласнасць саюза дасягаецца ўжо не адносінамі падначалення, а адносінамі кааперацыі, узаемнай зацікаўленасцю адзін у адным. Старая бюракратычная сістэма паслядоўна адбірала ўладу ў тых, для каго яна фармальна існавала. Небюракратычная, дэмакратычная сістэма дэлегіруе яе ўніз, вяртае радавым членам—«проста» пісьменнікам, акцёрам, жывапісцам.

Вядома, ломка старой структуры праходзіць з вялікімі цяжкасцямі. Трэба пераадольваць супраціўленне старога, сумненні тых, хто вагаецца, стэрэатыпы. Але ў саюзе кінематаграфістаў гэты працэс пачаўся, ён ідзе. Ідзе ён і ў саюзе тэатральных дзеячаў. У меншай ступені ў іншых саюзах, дзе пакуль вядуцца толькі гарачыя дыскусіі.

Нядаўна створаны камітэт маскоўскіх літаратараў «Красавік» («Пісьменнікі ў падтрымку перабудовы»). У яго «маніфесце» адзначаецца, што асноўнымі матывамі стварэння гэтай асацыяцыі стала трывога за лёсы перабудовы. «Мы глыбока перакананы,—гаворыцца ў «маніфесце»,—што Саюз пісьменнікаў аказаўся арганізацыяй, не прыгоднай для рэальнага ажыццяўлення перабудовы ў літаратурнай справе. Чатыры гады, што прайшлі з красавіка 1985 года, сведчаць аб гэтым зусім канкрэтна».

У Ленінградзе ў рамках Саюза пісьменнікаў створана асацыяцыя «Садружнасць». Галоўныя яе мэты—адмаўленне ад камандна-адміністрацыйнага метаду кіраўніцтва літаратурай, адраджэнне ініцыятывы і чалавечай годнасці пісьменніка, творчая незалежнасць.

Бадай, ужо цяпер можна сцвярджаць, што структура творчых саюзаў нарэшце будзе прыведзена ў адпаведнасць з існуючымі грамадскімі зменамі. Творчыя саюзы—гэта не міністэрствы літаратуры, архітэктуры, музыкі. Не кантралюючыя органы, а творчыя арганізацыі свабодных мастакоў.

«Сама ідэя кіравання культурай,—падкрэсліў Вячаслаў Глазычаў, сакратар праўлення Саюза архітэктараў СССР,—ёсць ідэя заганная. Кіраваць культурай нельга, можна стымуляваць яе развіццё».

Нядаўна газета «Советская культура» апублікавала артыкул спецыялістаў у галіне арганізацыі кіравання Эдуарда Гушчына і Аляксандра Крыўцова. Гаворачы аб застоі і тармажэнні ў творчых саюзах, яны ў той жа час сцвярджаюць: «Але якраз менавіта цяпер, як гэта ні парадаксальна гучыць, мы становімся сведкамі драматычных падзей па стварэнню творчай арганізацыі **прынцыпова новага тыпу.** Менавіта цяпер пачаўся якасна новы і па-сапраўднаму незваротны этап перабудовы—дэмантаж уласнай бюракратычай сістэмы і калектыўнае «вырошчванне» элементаў спрадвечна дэмакратычнага грамадскага арганізма».

Мастацкая інтэлігенцыя імкнецца, каб творчыя саюзы актыўна ўдзельнічалі ва ўсіх працэсах перабудовы і перабудоўваліся самі. Умовы для гэтага сёння існуюць. Існуюць і магчымасці. Упершыню толькі ад саміх мастакоў, ад іх волі, ініцыятывы, дзейнасці залежыць усё астатняе.

Гаўрыіл ПЕТРАСЯН.

РАБОТА З ВЫСТАЎКІ



Вядомая мінская мастачка Нінэль Шчасная наладзіла выстаўку-продаж сваіх твораў. У дзвюх залах размясціла плён сваёй даўняй і нядаўняй працы: партрэты, нацюрморты, пейзажы, вітражы, кераміку...

Буяюць фарбы. Лашчаць і радуюць вока.

...Кволая жаночая постаць ля акна, за якім цэлы свет. І свет гэты напоўнены любоўю, гармоніяй, чароўнасцю, пяшчотай. Але раптам аж працяло ад холаду. Бо ў гэты свет, парушаючы ўсе законы гармоніі, нахабна ўварвалася і зручна ўладкавалася цёмная сіла.

Спыніся ля карціны і ты, глядач! Перад намі толькі што скончанае палатно. Аўтар назвала яго «Пачвара і народ».

Вось яна, гэтая крывава-малінавая брыдота, уладарна і ўпэўнена сядзіць на адной шалі сусветных вагаў, як на царскім троне. А на другой шалі — безліч маленькіх фігурак, людская маса. На пальцах у пачвары пярсцёнкі. Злавесны халодны свет ад іх, нібы лазерны прамень, прабівае наскрозь людзей, што збіліся ў клубок. Агортвае жах. Неўзабаве гутарым з Нінэль Шчаснай пра гэту работу.

— Вобраз пачвары ў карціне не трэба разумець вузка і спрошчана, як нейкую пэўную асобу. Мне хацелася надаць пачвары касмічны характар. Барацьба сіл Дабра і Зла ў свеце — адвечная тэма мастацтва. Чалавецтва, імкнучыся да навукова-тэхнічнага прагрэсу, да авалодання тайнамі атама, аказалася палоннікам, ахвярай цывілізацыі.

Чалавецтва зараз робіць усё, каб знішчыць сябе. Кожны дзейнічае, як вінцік вялізнага механізма. А трэба, каб кожны адчуваў, што ён Чалавек і ў яго павінна быць будучыня, і самая вялікая каштоўнасць — жыццё. На гэта, дарэчы, у глыбінным сваім сэнсе накіравана наша перабудова.

НА ЗДЫМКУ: Н. ШЧАСНАЯ. «Пачвара і народ».

АЙЧЫННАЕ КІНО: ШТО НАПЕРАДЗЕ?

І ПРЭМІІ, І ПАГАДНЕННІ

Савецкае кіно сёння—не толькі з'ява ў сусветнай культуры, але і актыўны прапагандыст і ўдзельнік падзей, што адбываюцца ў нашай краіне. Хаця лічбы—рэч сумная, але дакладная і неабходная. Старшыня Дзяржкіно СССР Аляксандр Камшалаў расказаў, што ў СССР дзейнічаюць каля двухсот тысяч кінаўстановак, буйных жа кінатэатраў—толькі 5 тысяч, прычым сёння робіцца ўпор на стварэнне шматзальных кінатэатраў для розных груп насельніцтва. Час гігантаманіі, калі ў кожнай рэспубліцы, ледзь ці не ў кожным горадзе імкнуліся будаваць шматтысячныя кінатэатры з мармуру, прайшоў, пакінуўшы нам на памяць вялікія, нічым не апраўданыя выдаткі.

39 кінастудый краіны робяць штогод 150—160 мастацкіх, 110—120 тэлевізійных і каля паўтары тысячы неігравых фільмаў. Прыбытак ад гэтых карцін складае больш чым мільярд рублёў. Старшыня Дзяржкіно справядліва скардзіцца на вялікі падатак, які даводзіцца плаціць у бюджэт (55 працэнтаў з кожнай гарадской кінаўстаноўкі і 10 працэнтаў з кожнай сельскай). Крытыкуе Камшалаў і цэны на кінабілеты, якія ў сярэднім па краіне за апошнія 30 гадоў выраслі на 6,3 капейкі і складаюць сёння ўсяго 27,8 капейкі, у той час як эксплуатацыйныя затраты на стварэнне фільмаў выраслі за той жа тэрмін у пяць разоў. Дзяржкамітэт робіць спробы вывесці творчых кінаработнікаў са штату кінастудый і заключаць з імі дагаворы. Гэта будзе садзейнічаць і лепшаму выкарыстанню іх таленту, і матэрыяльнаму стымуляванню. Дарэчы, Камшалаў расказаў аб тым, што ў Дзяржкамітэце падлічылі сярэднюю зарплату рэжысёраў-пастаноўшчыкаў (іх 440), атрымалася... 160 рублёў у месяц. І гэта не таму, што яны лянуюцца, а таму, што яны далёка не заўсёды маюць магчымасць працаваць. Варта прывесці толькі адзін прыклад. Славуты на ўвесь свет А. Таркоўскі за 25 гадоў работы ў СССР стварыў толькі пяць фільмаў.

А. Камшалаў запэўніў, што ў самы бліжэйшы час на ўсесаюзным і, магчыма, сусветным экране з'явяцца такія стужкі, як беларуская «Наш браняпоезд» (сцэнарый быў напісаны ў 1966 годзе), «Горад Зеро» К. Шахназарава, «Слуга» Абдрашытава (фільм быў удзельнікам кінафестывалю ў Заходнім Берліне), «Загана» студыі імя А. Даўжэнкі.

Цікавасць да савецкага кінамастацтва праяўляецца сёння не толькі ў немалой колькасці прэстыжных прэмій і прызоў (70—у 1988 годзе), атрыманых нашымі кінематаграфістамі на міжнародных фестывалях, але і ў падпісанні розных пагадненняў, стварэнні сумесных прадпрыемстваў з замежнымі кінафірмамі.

З ЧССР, напрыклад, падпісаны дагавор аб стварэнні двух сумесных прадпрыемстваў па вытворчасці кінакапіравальнай і праявачнай тэхнікі. Разам з Індыяй ужо створана сумеснае прадпрыемства па экспарту і імпарту фільмаў, вядуцца перагаворы па стварэнню такога ж прадпрыемства, якое будзе выпускаць бытавыя відэамагнітафоны і відэакасеты. У канцы лютага ў Вялікабрытанію выязджала дэлегацыя Дзяржкіно для перагавораў аб стварэнні сумеснай асацыяцыі. Вядуцца перагаворы з фірмамі Аўстрыі, Францыі і ФРГ аб будаўніцтве розных кінапрадпрыемстваў у нашай краіне, у прыватнасці ў Маскве і Падмаскоўі.

Асабліва цікавы праект стварэння з дапамогай фінскіх фірм кінабазы ў Ялце. Тут будзе пабудавана кінастудыя на 30—35 фільмаў у год, басейн для падводных здымкаў, флот і... пансіянат для дзяцей, якія будуць здымацца ў гэтых фільмах. Справа ў тым, што тут будуць стварацца прыгодніцкія фільмы пераважна для дзяцей.

З пачуццём жалю А. Камшалаў расказаў аб кінасувязях з ЗША. За апошнія гады і ў нас у краіне не раз праводзіліся прагляды амерыканскіх фільмаў, і ў Амерыцы лепш пазнаёміліся з нашай прадукцыяй, але да сённяшняга дня не можам дагаварыцца аб правядзенні абменных кінатыдняў. Яшчэ тры гады назад пасол СССР у ЗША Дубінін дасягнуў дамоўленасці аб правядзенні такіх тыдняў, тады ж праз акіян былі пасланы 30 савецкіх фільмаў, але адказу ад амерыканскага боку так і не было атрымана. Цяпер гэтыя фільмы маральна ўстарэлі, і тры месяцы назад былі адпраўлены яшчэ трыццаць ужо новых карцін, але адказу ранейшаму няма. Не ўдаецца пакуль купіць і выдатныя дыснееўскія фільмы—вельмі дорага просяць. Але перагаворы працягваюцца.

У апошні час мяняецца парадак правядзення фестываляў у нашай краіне. Іх цяпер больш за трыццаць, многія—міжнародныя. Маскоўскі кінафестываль цяпер будзе праводзіцца ў тры этапы: неігравога кіно, для дзяцей і юнацтва, мастацкіх фільмаў. Пакуль спыняе сваё існаванне Ташкенцкі фестываль. Дзяржкіно вядзе работу па ўдасканальванні яго формулы. У будучыні Дзяржкіно будзе старацца па магчымасці праводзіць кінаагляды ў невялікіх гарадах.

Генадзій ЛЯОНАЎ.

ПОЛЬСКІ ВУЧОНЫ АБ БЕЛАРУСКІМ МЫСЛІЦЕЛІ

УСЁ ПРА КАЗІМІРА ЛЫШЧЫНСКАГА

30 сакавіка 1989 года ў каралеўскім замку ў Варшаве адбылася навуковая сесія, прысвечаная 300-годдзю з дня пакутніцкай смерці выдатнага матэрыяліста і атэіста XVII стагоддзя Казіміра Лышчынскага. Менавіта тут, у самым цэнтры Варшавы, на рынку старога горада, непадалёку ад каралеўскага замка, тры стагоддзі назад упала пад сякерай ката галава філосафа, была спалена яго выдатная праца «Аб неіснаванні бога».

У памяць пра гэтую падзею Таварыства па распаўсюджанню свецкай культуры ПНР арганізавала навуковую сесію, на якую былі запрошаны вучоныя Польшчы, СССР, Італіі — тыя, хто займаецца вывучэннем светапогляду славутага мысліцеля. На сесіі было заслухана больш чым дзесяць навуковых дакладаў, у іх ліку і аўтара гэтых радкоў «Сацыяльная утопія Казіміра Лышчынскага». Тут жа ў каралеўскім замку яму быў уручаны медаль імя Тадэвуша Боя-Жэленьскага, вышэйшая ўзнагарода прэзідыума Таварыства па распаўсюджанню свецкай культуры, якой ён удастоіў кнігу «Казімір Лышчынскі». Яна напісана сумесна з Е. Пракошынай і выйшла ў выдавецтве «Беларусь» у 1986 годзе. На жаль, Е. Пракошына не змагла прыехаць у Варшаву для атрымання ўзнагароды. Тут жа патрыярх лышчынсказнаўства прафесар Анджэй Навіцкі падарыў аўтару гэтых радкоў сваю кнігу «Казімір Лышчынскі. 1634—1689», якая выйшла напярэдадні гэтай даты на польскай мове ў Лодзі. Са зместам яе мне і хацелася б пазнаёміць чытачоў газеты. Але спачатку некалькі слоў пра яе аўтара.

Прафесар Анджэй Навіцкі — гэта вядомы далёка за межамі ПНР вучоны, буйны спецыяліст у галіне гісторыі польскай і італьянскай філасофіі. Ён правадзейны член Акадэміі маральных і палітычных навук у Неапалі, заграніччны член Навуковага каардынацыйнага савета па вывучэнню ідэйнай спадчыны Д. Ваніні, ганаровы грамадзянін гарадоў Таурызана і Ноля ў Італіі. За больш чым 50 гадоў навуковай дзейнасці прафесар А. Навіцкі апублікаваў звыш 1 000 розных работ, у тым ліку больш дзесяці аб'ёмных манаграфій. Аднак сярод гэтай багатай навуковай спадчыны асобае месца займаюць публікацыі, прысвечаныя Казіміру Лышчынскаму, з біяграфіяй якога малады даследчык пазнаёміўся ў кастрычніку 1934 года. Менавіта з гэтага часу пачынаецца цікавасць вучонага да гісторыі атэістычнай думкі. З 1957 года прафесар А. Навіцкі рэгулярна выступае ў польскім і замежным друку па гэтай тэме. Можна без перабольшання сказаць, што з імем і навуковай дзейнасцю прафесара А. Навіцкага звязана адраджэнне навуковай цікавасці да асобы і светапогляду К. Лышчынскага не толькі ў Польшчы, але і ў іншых краінах. Шырокі рэзананс сярод даследчыкаў выклікалі знойдзеныя і апублікаваныя прафесарам А. Навіцкім у 1957 годзе пяць фрагментаў са спаленага ў 1689 годзе трактата К. Лышчынскага «Аб неіснаванні бога», якія неаднаразова перадрукоўваліся затым у СССР, Польшчы, Італіі. І вось цяпер значная частка гэтай вялікай шматгадовай навуковай працы, распыленай раней у шматлікіх публікацыях, выйшла ў форме (пакуль невялікай, каля 6 друкаваных аркушаў) манаграфіі.

У кнізе пяць раздзелаў, прысвечаных важным этапам жыцця мысліцеля, яго светапогляду. Паколькі эпоха і асоба Лышчынскага-мысліцеля дастаткова добра вядомы чытачам газеты (нарысы пра яго публікаваліся на старонках «Голасу Радзімы»), не буду пераказваць усяго зместу кнігі, спынюся толькі на бясспрэчных вартасцях данай публікацыі.

Па-першае, кніга напісана на аснове глыбокага, фундаментальнага вывучэння крыніц. Выяўленыя да сёння рукапісныя матэрыялы, што тычацца жыцця і поглядаў Лышчынскага, знаходзяцца ў архівах Варшавы, Кракава, Познані, Гданьска, Вроцлава, Курніка, Берліна, Вены, Венецыі, Фларэнцыі, Рыма, Неапаля, Мінска, Вільнюса, Львова. Абсалютная большасць гэтых рукапісаў даследчыкам дасканала вывучана, на іх падставе будуецца даная публікацыя.

Па-другое, кніга прафесара А. Навіцкага абапіраецца на самую поўную бібліяграфію работ пра Лышчынскага, якую вучоны выявіў і апублікаваў. Яна налічвае больш за 600 розных назваў, пачынаючы з 1669 года (першага ўпамінання пра Лышчынскага ў літаратуры) да сённяшняга дня.

Па-трэцяе, работа прафесара А. Навіцкага заснавана на ўмелым каменціраванні крыніц, якія дайшлі да нас, што з'яўляецца вынікам шматгадовых роздумаў даследчыка над іх зместам. Напрыклад, закранём хаця б назву працы мысліцеля «Аб неіснаванні бога». Да Лышчынскага, адзначае вучоны, тэолагамі «напісаны былі сотні трактатаў аб існаванні бога. Лышчынскі быў першым у гісторыі сусветнай культуры вучоным, які даў свайму трактату незвычайны тытул: «Аб неіснаванні бога». Такім чынам, ужо ў гэтым, з пункту гледжання вучонага, праявілася наватарства мысліцеля. Далей прафесар А. Навіцкі адзначае, што да Лышчынскага тэолагі пісалі аб атэістах «яны» (яны, атэісты, так думаюць, так лічаць і г. д.). У сваёй працы Лышчынскі ўпершыню ў гісторыі філасофскай думкі ўвёў катэгорыю «мы, атэісты» (г. зн. мы, атэісты, так думаем, так лічым і г. д.). «Стварэнне гэтай катэгорыі,— піша А. Навіцкі,— з'яўляецца арыгінальным, творчым укладам мысліцеля ў гісторыю еўрапейскай філасофскай думкі».

Нягледзячы на мноства выяўленых да гэтага часу крыніц, яны ніколі не змогуць нам замяніць страчанага трактата мысліцеля. Таму ўсе нашы спробы ўзнавіць сістэму філасофскіх поглядаў мысліцеля, лічыць прафесар А. Навіцкі, будуць мець характар гіпотэзы. Тым не менш, прачытаўшы раздзел кнігі, прысвечаны філасофскім поглядам Лышчынскага, можна скласці ўяўленне аб укладзе мысліцеля ў гісторыю еўрапейскай філасофіі.

Але самае галоўнае, што хацелася б адзначыць у рэцэнзіі: вучоны не збіраецца спыняць работы па данай тэме. Выявіўшы і склаўшы самую поўную бібліяграфію аб Лышчынскім, высветліўшы, што публікацыі пра мысліцеля з'яўляліся на 15 мовах, прафесар А. Навіцкі не траціць надзеі перавысіць гэтыя дасягненні. «Нельга выключаць,— піша прафесар у заключэнні сваёй кнігі,— што ў ходзе далейшых пошукаў будуць выяўлены публікацыі ў іншых мовах, а таксама публікацыі, што з'явіліся раней за тыя, якія да сёння ўдалося выявіць». Пажадаем вучонаму поспеху ў гэтым бясконцым, нястомным пошуку.

Думаю, што кнігу прафесара А. Навіцкага пра Казіміра Лышчынскага з вялікай цікавасцю прачытае кожны, каго вабіць гісторыя і культура Беларусі, Літвы і Польшчы XVII стагоддзя.

Вячаслаў ШАЛЬКЕВІЧ.





Ёсць людзі, якія пражылі жыццё без гучнай славы, але пакінулі пасля сябе спадчыну, і ёю ганарацца нашчадкі. Такім быў і Фёдар Шкляраў з горада Ветка Гомельскай вобласці — чалавек з рукамі майстра і душой мастака. Ён працаваў цесляром на суднаверфі, маляром, рабочым па вырабу арыгінальных рэчаў з металу і дрэва.

Вялікая і бясцэнная работа Ф. Шклярава па збору і захаванню твораў народных умельцаў Веткаўшчыны — гэтага самабытнага рэгіёна беларускага Палесся. Ні для кога не сакрэт, як варварску знішчаліся ў былыя гады іконы, старадрукі, царкоўныя рэчы. Хутка знікалі з ужытку прадметы сельскага быту. І ў тым, што сведчанні мінулага, многія творы вядомых і невядомых народных майстроў, не прапалі, мы ў немалой ступені абавязаны Фёдару Шкляраву. Гэта ён стварыў унікальны музей народнай творчасці у Ветцы, куды перадаў вялікую колькасць прадметаў даўніны з асабістай калекцыі. У музеі Ф. Шкляраў быў не толькі дырэктарам: мастак, рэзчык па дрэву — сваімі рукамі ён упрыгожваў будынак, стварыў яго своеасаблівы інтэр'ер.

Пра ўсё гэта і расказвае экспазіцыя, што адкрылася ў Гомелі ў выставачнай зале Саюза мастакоў СССР,— даніна памяці калекцыянеру, грамадзяніну, патрыёту.

Я. КАЗЮЛЯ.

НА ЗДЫМКАХ: у адной з залаў выстаўкі, прысвечанай памяці Ф. Шклярава; работа веткаўскай школы іканапісу XIX—XX стагоддзяў «Цуд Георгія аб зміі»; Ф. ШКЛЯРАЎ (злева) у час экспедыцыі па пошуку рукапісных і старадрукаваных кніг. Здымак з архіва.

Фота аўтара.

У КРАІ МАХТУМКУЛІ

У ашхабадскім выдавецтве «Туркменістан» сёлета выходзіць паэтычны зборнік Максіма Танка. Пераклаў кнігу вершаў на туркменскую мову паэт Сапар Ураеў.

— Да гэтай працы, зразумела, я прыйшоў не адразу. Даўно наважыўся было перакласці нешта ёмістае, важкае з беларускай паэзіі,— гаворыць Сапар Ураеў,— перачытваў старонкі лірыкі Купалы, сачыў за публікацыямі сучаснай паэзіі нашых беларускіх сяброў. У творах Танка, на мой погляд, спалучылася, сышлося многае. Таму і ўзяўся за іх пераклад.

Кніжка М. Танка, што ідзе да туркменскага чытача,— не адзіная кропка сутыкнення народнага паэта Беларусі з краем Махтумкулі, з літаратурай Туркменістана. Максім Танк быў госцем старонкі бяскрайніх пясчаных прастораў. Сустракаўся і з Сапарам Ураевым, і з народным паэтам Туркменістана Керымам Курбанняпесавым. Той, дарэчы, таксама перакладаў вершы М. Танка.

А зараз вось загаворыць з туркменскім чытачом і асобны зборнік Танка. Ён папоўніць бібліятэчку кніг беларускіх аўтараў, што ўбачылі свет у Туркменіі. Асобнымі выданнямі ўжо прадстаўлены творы В. Быкава, Я. Купалы, Я. Коласа, І. Шамякіна, П. Броўкі...

А. КАРЛЮКЕВІЧ.

«А ГАРМОНІК ГРАЕ, ГРАЕ...»

У мінскім Палацы культуры і спорту чыгуначнікаў імя Леніна створаны клуб «Гармонік», які аб'яднаў аматараў ігры на баяне, акардэоне, гармоніку. Гэта першы крок у напрамку да стварэння рэспубліканскай секцыі баяна—акардэона пры Музычным таварыстве БССР.

Калісьці ніводнае вяселле ці свята не абыходзілася без гарманіста. Сёння ж гукі баяна, акардэона, гармоніка не часта пачуеш нават на вясковай вуліцы, не гаворачы ўжо пра гарадскія. А між тым гэтыя інструменты — частка гісторыі музычнай культуры беларускага народа. Гармонік разам са скрыпкай, дудкай, цымбаламі і ўдарнымі ў розным спалучэнні ўтвараў інструментальныя ансамблі, якія існавалі, бадай што, у кожнай вёсцы ці мястэчку. Сёння такіх ансамбляў засталося вельмі мала, ды і іграюць на народных музычных інструментах людзі пераважна сталага ўзросту. А што нас чакае праз 10—20 гадоў? Ці не застануцца толькі ўспаміны пра ўдалых вясковых музыкаў?

Пытанні, на жаль, не беспадстаўныя. Вось такі, скажам, прыклад. На канцэртах агляду-конкурсу народных і ўзорных аркестраў народных інструментаў горада Мінска, які адбыўся сёлета, у глядзельнай зале было вельмі мала слухачоў. Менш, чым на сцэне. Як жа адрадзіць павагу да народна-інструментальнага жанру, як падняць прэстыж народных інструментаў?

Таму і радавала з'яўленне аргкамітэта на чале з М. Коласавым, які ўзяўся ствараць першы ў Мінску клуб аматараў-гарманістаў. Клуб мае на мэце аб'яднаць усіх аматараў, якія любяць гармонік, баян, акардэон, імкнуцца ўдасканаліць сваё выканаўчае майстэрства ці проста прыемна правесці вольны час, вывесці гармонік на вялікую сцэну, наблізіць яго да народа.

НА ТУРЫСЦКІМ ШЛЯХУ

МАЦІ ПАЛТАЎСКАЙ БІТВЫ

Шмат цікавага чакае наведвальнікаў летам гэтага года, калі яны будуць прысутнічаць на святочным прадстаўленні ў вёсцы Лясное Слаўгарадскага раёна Магілёўскай вобласці, прысвечаным перамозе рускіх воінаў над шведамі ў 1708 годзе. Прысутныя стануць сведкамі тэатралізаваных эпізодаў ваенных баёў, пройдуцца па полі, дзе адбылася бітва, убачаць мемарыяльную капліцу.

Як адзначаюць гісторыкі і, у прыватнасці, беларускі даследчык В. Чарнатаў, асноўныя сілы шведскай арміі пад кіраўніцтвам караля Карла XII летам 1708 года наступалі на Смаленск цераз Магілёў. На сваім шляху шведы рабавалі беларускія паселішчы, адбіралі хлеб, жывёлу, птушку. Аб'яднаныя сілы ворагаў мелі намер разбіць рускія войскі, узяць Маскву і знішчыць Расію як дзяржаву.

З 19 па 21 верасня корпус Левенгаупта, пераправіўшыся цераз Днепр каля Шклова, накіраваўся да Прапойска (сёння Слаўгарад). Рускія войскі вырашылі ў што б там ні стала перашкодзіць злучэнню корпуса Левенгаупта з асноўнымі сіламі шведаў. Для гэтага Пётр I арганізаваў з корпуса Б. Шарамецьева «лятучы» корпус з 10 драгунскіх і 3 пяхотных палкоў. Адначасова 5-тысячнаму кавалерыйскаму корпусу генерала Р. Баўэра было загадана рухацца на злучэнне з «лятучым» корпусам і выдзеліць атрад з тысячы кавалерыстаў, якія павінны былі дайсці да Прапойска і захапіць пераправу цераз раку Сож. 27 верасня ў раёне вёскі Доўгі Мох (за 15 кіламетраў на паўночны захад ад вёскі Лясное) авангард «лятучага» корпуса зблізіўся са шведамі, але тыя не прынялі бой і адышлі да вёскі Лясное.

28 верасня рускія войскі атакавалі шведаў ля вёскі Лясное. У разгар бою падаспелі кавалерысты «лятучага» корпуса, і аб'яднанымі сіламі рускіх шведскі корпус быў разбіты. Шведы страцілі да 8 тысяч забітымі, каля 900 салдат здаліся ў палон. Частка разбрылася па лясах, кінуўшы артылерыю і абоз.

Бітву пад Лясной Пётр I назваў «маці Палтаўскай бітвы». Поле бою на працягу стагоддзяў свята аберагалася і не апрацоўвалася жыхарамі вёскі Лясное і прылеглых паселішчаў. Не вельмі змяніўся і навакольны ландшафт.

У 1908 годзе ў гонар 200-годдзя перамогі рускіх войск над шведамі каля вёскі Лясное быў узведзены помнік вышынёй 3,5 метра, які ўяўляе сабой гранітную скалу. А на месцы бою, дзе быў нанесены рашучы ўдар па шведах,— храм-помнік, ці, як інакш яго называюць, капліца. На полі, дзе ішла бітва, як вядома, стаяла царква, якая ў ходзе бою была разбурана. Пасля бою Пётр I загадаў зрубіць новую, што і было зроблена за тры дні. Потым будынак царквы стаў непрыгодным, і толькі, дзякуючы энтузіязму і настойлівасці выдаўца «Белорусского сборника» Е. Раманава, быў пабудаваны новы храм. Урачыстае адкрыццё яго адбылося 28 верасня 1912 года.

Цяпер у капліцы размясціўся ваенна-гістарычны музей — філіял Магілёўскага абласнога. Тут шырока прадстаўлены дакументальна-прадметныя, тэкставыя і графічныя матэрыялы. Выстаўлены для агляду воінскі рыштунак і зброя рускіх воінаў і шведаў, знойдзеныя на месцы баёў.

З гэтага года архітэктурны мемарыял уваходзіць у экскурсійнае «залатое» кальцо.

НА ЗДЫМКУ: мемарыяльны храм-капліца.

В. БАСЬКО.

У ВАШУ КАЛЕКЦЫЮ

НОВЫЯ СЕРЫІ

Міністэрства сувязі нашай краіны выпусціла некалькі цікавых серый паштовых марак. Адна з іх прысвечана XIX Усесаюзнай партканферэнцыі, якая адбылася летась. На трох мініяцюрах дадзены лозунгі: «Саветам — паўнаўладдзе!», «Працоўным калектывам — самакіраванне!» і «Зробім селяніна гаспадаром на зямлі!» З гэтымі заклікамі нібыта перакліканцца лозунгі далёкага 1917 года: «Уся ўлада Саветам!», «Заводы — рабочым!», «Зямля — сялянам!».

Пошта працягвае выпуск дабрачынных марак. Новая серыя складаецца з пяці мініяцюр і выдадзена пад эгідай фонду дапамогі заапаркам. На марках, выдадзеных у счэпцы, паказаны воўк, лісіца, мядзведзь, рысь і кабан. Даплатныя наміналы марак пойдуць на добраўпарадкаванне заапаркаў, у счэпцы маецца купон з адлюстраваннем зебры — эмблемы фонду.

У канцы мінулага года ў Арменіі адбылося моцнае землетрасенне, якое выклікала шматтысячныя ахвяры. Дапамогу пацярпеўшым аказвае ўвесь свет. Міністэрства сувязі СССР выпусціла спецыяльную серыю марак, скампанаваную ў квартблок. На мініяцюрах паказаны рэліквіі армянскага народа. На адной з іх наміналам 20+10 капеек адлюстравана залатая манета I стагоддзя да н. э. з партрэтам Тыграна Вялікага. Наступная марка (намінал 30+15 капеек) знаёміць з шэдэўрам старажытнаармянскай архітэктуры — храмам святой Рыпсіме, узведзеным у 618 годзе. На заключнай марцы серыі (50+24 кап.) ёсць фрэска сабора ў Эчміадзіне — «Багародзіца з дзіцём». Малюнак купона знаёміць нас з хачкарам — творам армянскай народнай творчасці, тэкст на купоне «Пацярпеўшай ад землетрасення Арменіі» дадзены на рускай і армянскай мовах. Усе сродкі, атрыманыя ад продажу марак, будуць перададзены ў фонд дапамогі Арменіі.

Папоўнілі свае калекцыі і аматары касмічнай філатэліі. Паштовы блок прысвечаны універсальнай ракетна-касмічнай транспартнай сістэме «Энергія». На марцы блока — адлюстраванне «Бурана» і надпіс: «Першы палёт арбітальнага карабля многаразавага выкарыстання «Буран».

Леў КОЛАСАЎ.

спорт

Прайшлі чарговыя адборачныя гульні першынства свету па футболу. Зборная СССР сустракалася ў Стамбуле з камандай Турцыі і перамагла з лікам 1 : 0. Пасля чатырох матчаў савецкія спартсмены ўзначалілі табліцу розыгрышу ў сваёй групе. Цікава, што ва ўсіх сустрэчах удала выступаў мінчанін Сяргей Алейнікаў.

Там жа, у Турцыі, на чэмпіянаце Еўропы вызначыліся беларускія барцы вольнага стылю. Арават Сабееў узнагароджаны залатым медалём, а Камалутдзін Абдулдаудаў — сярэбраным.

Тры матчы правяла ў ФРГ зборная жаночая каманда СССР па гандболу. Два з іх завяршыла на сваю карысць: 21:17 і 23:22. У апошняй гульні вызначылася мінчанка Святлана Жыхарава, якая закінула ў вароты зборнай ФРГ сем мячоў.

І апошняе паведамленне з розыгрышу Кубка Савецкага Саюза па самба. Такога поспеху яшчэ ніколі не ведала каманда беларускіх спартсменаў. Адразу пяць самбістаў нашай рэспублікі — В. Япрынцаў, М. Цыпандзін, Ф. Агееў, М. Багіраў, Э. Грамс і І. Мятліцкі — сталі пераможцамі розыгрышу Кубка і заваявалі права абараняць гонар краіны на чэмпіянаце Еўропы, які хутка пачнецца ў Англіі.

Давер. Фота У. МЯЖЭВІЧА.

Зінаіда Лобач прыкладна ў 1934—1935 гадах.

ВАС ШУКАЮЦЬ І ЧАКАЮЦЬ СВАЯКІ

У 1905 годзе з вёскі Макаўчыцы Дзяржынскага раёна Мінскай вобласці выехала Ганна Макараўна Калечыц. У той час ёй было 17 гадоў. У ЗША яна выйшла замуж за земляка Івана Лобача. Жылі яны ў Нью-Йорку, у Брукліне, па Барэт стрыт, 671 (магчыма, адрас не дакладны). У Ганны і Івана Лобачаў нарадзілася дачка Зінаіда.

Пасля вайны некаторы час Ганна Макараўна Лобач падтрымлівала перапіску са сваёй малодшай сястрой Марыяй Макараўнай Калечыц, потым перапіска спынілася.

Зінаіду Іванаўну (Лобач) шукае яе дваюрадная сястра (дачка Марыі Макараўны Калечыц) — Ларыса Леанідаўна Юрцэвіч.

Просім усіх, каму што-небудзь вядома пра лёс Зінаіды Лобач і яе блізкіх, паведаміць у рэдакцыю ці па адрасу:

БССР, 220090, г. Мінск,
вул. Кальцова, дом 8, корпус 3, кв. 37.
Юрцэвіч Ларысе Леанідаўне.

РАДЫЁСТАНЦЫЯ «САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ» ШТОДЗЁННА ВЯДЗЕ СВАЕ ПЕРАДАЧЫ З МІНСКА

Тых, хто цікавіцца сённяшнім днём Бацькаўшчыны, ходам перабудовы, абнаўлення ўсіх сфер жыцця нашага грамадства, гісторыяй і сучасным развіццём нацыянальнай культуры, літаратуры, мовы, хто хоча паслухаць творы беларускага музычнага фальклору ці сучасных кампазітараў, запрашаем на перадачы радыёстанцыі «Савецкая Беларусь». Іх можна пачуць штодзённа з 21 гадзіны 30 мінут да 22 гадзін паводле маскоўскага часу (ці з 19 гадзін 30 мінут да 20 гадзін паводле сярэднееўрапейскага часу) на частотах 7330, 9560, 9600, 11780 і 11960 кілагерц (у сераду, суботу і нядзелю яны гучаць на нямецкай мове).

Другая наша праграма выходзіць у эфір штодзённа з 00.30 да 01.00 гадзіны паводле маскоўскага часу (ці з 22 гадзін 30 мінут да 23 гадзін паводле сярэднееўрапейскага часу) на частотах 6185, 7300 і 7420 кілагерц.

Слухайце перадачы радыёстанцыі «Савецкая Беларусь»!

Вашы заўвагі і меркаванні аб іх зместе, прапановы, пажаданні, пытанні дасылайце па адрасу: 220807, г. Мінск, вул. Чырвоная, 4.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ

НАШ АДРАС:
МІНСК-ГСП, ЛЕНІНСКІ ПРАСПЕКТ, 44.
ТЭЛЕФОНЫ: 33-01-97, 33-02-80, 33-03-15, 33-16-56, 33-07-82.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.
Індэкс 63854. Зак. № 585